WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

3 ВЕРАСНЯ 2010 г.
ПЯТНІЦА
№ 172
(26780)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

## У БЕЛАРУСІ БУДЗЕ СКАРОЧАНЫ ПЕРАЛІК ЛІЦЭНЗУЕМЫХ ВІДАЎ ДЗЕЙНАСЦІ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 1 верасня 2010 года падпісаў указ № 450 «Аб ліцэнзаванні асобных відаў дзейнасці».

У мэтах лібералізацыі ўмоў ажыццяўлення эканамічнай дзейнасці ўказам прадугледжваецца адмена ліцэнзавання 16 відаў дзейнасці, 7 з якіх уключаюць у сябе 59 складаючых работ (паслуг), а таксама каля 60 работ (паслуг) па іншых 13 відах дзейнасці, ліцэнзаванне якіх захоўваецца; аб'яднанне двух відаў дзейнасці ў адзін. Указ уступае ў сілу з 1 студзеня 2011 года. Пры гэтым указам прадугледжана, што юрыдычныя і фізічныя асобы, а таксама індывідуальныя прадпрымальнікі маюць права не працягваць у перыяд з дня афіцыйнага апублікавання ўказа да яго ўступлення ў сілу тэрмін дзеяння спецыяльных дазволаў (ліцэнзій) на ажыццяўленне відаў дзейнасці або спецыяльных дазволаў (ліцэнзій), якія ўключаюць толькі тыя складаючыя віды дзейнасці работы і (або) паслугі, ліцэнзаванне якіх адмяняецца. Яны могуць ажыццяўляць дзейнасць на падставе спецыяльных дазволаў (ліцэнзій), выдадзеных да 1 студзеня 2011 года, пры ўмове выканання патрабаванняў, прадугледжаных указам, да заканчэння тэрміну іх дзеяння.

Адмена патрабаванняў аб ліцэнзаванні асобных відаў дзейнасці і складаючых іх работ (паслуг), аптымізацыя парадку і скарачэнне тэрмінаў правядзення ліцэнзійных працэдур, увядзенне комплекснага рэгулявання адносінаў у сферы ліцэнзавання, прадугледжаныя ўказам, забяспечаць зніжэнне адміністрацыйнай нагрузкі на дзейнасць суб'ектаў гаспадарання.

## У БЕЛАРУСІ ДЛЯ ДЗЯРЖПРАДПРЫЕМСТВАЎ УСТАНОЎЛЕНЫ ШТОКВАРТАЛЬНЫ ТЭРМІН ВЫПЛАТЫ ЧАСТКІ ПРЫБЫТКУ Ў БЮДЖЭТ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 1 верасня 2010 года падпісаў указ № 449 «Аб унясенні змянення ва Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2005 года № 637». Для ўстанаўлення адзіных нормаў па залічэнні часткі прыбытку, павышэння зацікаўленасці адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак базавага ўзроўню ў павышэнні эфектыўнасці работы арганізацый камунальнай уласнасці, гаспадарчых таварыстваў, у капітале якіх ёсць доля бюджэтаў базавага і прамежкавага ўзроўняў, указам прадугледжана, што частка прыбытку (даходу) падлягае пералічэнню ў адпаведнасці з указам № 637 у рэспубліканскі і абласныя бюджэты, а таксама ў бюджэты прамежкавага і базавага ўзроўняў. У мэтах спрашчэння разлікаў з бюджэтам і скарачэння колькасці плацяжоў указам устаноўлены штоквартальны тэрмін выплаты часткі прыбытку, што падлягае пералічэнню ў бюджэт у адпаведнасці з указам № 637 замест раней дзейнага штомесячнага тэрміну выплаты.

## ПАДЗЯКА ПРЭЗІДЭНТА АБ'ЯЎЛЕНА 16 РАБОТНІКАМ РОЗНЫХ СФЕРАЎ

За эфектыўнае забеспячэнне падрыхтоўкі і паспяховае выступленне нацыянальных камандаў Беларусі на XXI зімовых Алімпійскіх гульнях 2010 года ў Ванкуверы (Канада) Падзяка Прэзідэнта аб'яўлена старшаму трэнеру нацыянальнай каманды Беларусі па фрыстайле Васілю Вараб'ёву, начальніку каманды — старшаму трэнеру нацыянальнай каманды па фрыстайле Анатолю Пастухову, старшаму трэнеру нацыянальнай каманды па біятлоне Аляксандру Усцінаву і іншым.

Старшыня савета Арганізацыйнай структуры Мінска і Мінскай вобласці рэспубліканскага дзяржаўна-грамадскага аб'яднання ДТСААФ Юрый Вараб'ёў адзначаны Падзякай Прэзідэнта за ўзорнае выкананне службовых абавязкаў... За шматгадовую плённую працу, значны асабісты ўклад у развіццё беларускай журналістыкі адзначаны спецыяльныя карэспандэнты аддзела рэпарцёраў АТН Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Наталля Жаркевіч і Наталля Марцалева, каментатар дырэкцыі інфармацыйнага і грамадска-палітычнага вяшчання Першага нацыянальнага канала Беларускага радыё НДТРК Алена Швайко.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## ПАШЫРАНЫ ПЕРАЛІК ТАВАРАЎ ДЛЯ ЛЬГОТНАГА КРЭДЫТАВАННЯ ВЫПУСКНІКОЎ ВНУ І ССНУ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 1 верасня 2010 года падпісаў указ № 448 «Аб унясенні змянення ва Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 27 лістапада 2000 года № 631». У сувязі з ростам матэрыяльнай забяспечанасці насельніцтва патрэбнасці выпускнікоў таксама істотна змяніліся: узнікла неабходнасць у набыцці камп'ютараў, бытавой тэхнікі.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Крыніца для Залатых**

**Павел і Святлана Залатыя — вясельная пара з Клімавічаў — згодна з мясцовай традыцыяй наведалі крыніцу каля вёскі Зімніцы. Самая даўняя назва крыніцы — Грымучая. А цяпер яе называюць яшчэ і Вясельнай. Каля яе маладыя абавязкова пакідаюць каляровую стужку — сімвал вернасці і згоды. І абавязкова пояць адно аднаго з далоняў.**

**Залатыя вучыліся ў адной школе. Цяпер працуюць у будаўніцтве і завочна вучацца ў ВНУ. Мараць пра свой дом, вялікую дружную сям'ю, чыстае, як крыніца, каханне.**

## У ХАЛАДЗІЛЬНЫМ ЦЭХУ ПРАДПРЫЕМСТВА «САВУШКІН ПРАДУКТ» АДБЫЛАСЯ ЎЦЕЧКА АМІЯКУ. ДВА ЧАЛАВЕКІ ПАЦЯРПЕЛІ

Як расказаў карэспандэнту «Звязды» першы намеснік начальніка Брэсцкага абласнога ўпраўлення МНС Алег Лашко, на пульт аператыўнага дзяжурнага МНС сігнал аб аварыі ў адным з цэхаў прадпрыемства паступіў у 12 гадзін 4 хвіліны другога верасня. У памяшканні халадзільнага цэха камбіната адбыўся выкід аміяку. Па папярэдніх разліках, у цэх трапіла каля 30 кілаграмаў небяспечнага рэчыва.

Адразу да месца аварыі прыбыло дзевяць падраздзяленняў МНС. Аміячны трубапровад перакрылі і ўцечку лакалізавалі. 50 чалавек было аператыўна эвакуявана з памяшкання. На жаль, два работнікі цэха — мужчына і жанчына — паспелі надыхацца шкодным газам. Яны адчулі сябе дрэнна і звярнуліся ў медпункт свайго прадпрыемства, адкуль былі накіраваны ў бальніцу.

Алег Іванавіч гутарыў з карэспандэнтам адразу, як вярнуўся з месца здарэння. Ён расказаў таксама, што на «Савушкін прадукт» аператыўна прыбылі супрацоўнікі цэнтра гігіены і эпідэміялогіі, а таксама інспекцыі аховы навакольнага асяроддзя. Яны правялі неабходныя замеры вакол будынкаў малочнага камбіната, але перавышэння дозы забруджвання паветра не выявілі. Таму для жыхароў бліжэйшых дамоў няма прычын непакоіцца. У самім жа памяшканні цэха на той час (15 гадзін другога верасня — **С. Я.**) канцэнтрацыя аміяку перавышала дапушчальныя нормы прыкладна ў паўтара раза. Прымаліся ўсе неабходныя меры, каб ачысціць паветра цэха.

Прычыны здарэння пакуль не называюцца. Створана адпаведная камісія, якая павінна расследаваць сітуацыю і назваць прычыны ўцечкі небяспечнага газу.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## ЭЛЕКТРОННЫЯ КНІГІ НЕ ЗМОГУЦЬ ВЫЦЕСНІЦЬ ДРУКАВАНЫЯ ВЫДАННІ

Такі пункт гледжання выказала **першы намеснік міністра інфармацыі Беларусі Лілія АНАНІЧ**, размаўляючы з журналістамі на XXIII Маскоўскай міжнароднай кніжнай выставе-кірмашы.

«Электронная кніга дапаўняе традыцыйную кнігу, развівае яе, але выцесніць не зможа, — сказала Лілія Ананіч. — Бо выданне кнігі — працэс глыбока творчы. Гэта работа не толькі аўтара, але і паліграфіста, распаўсюджвальніка, кожны з іх уносіць свой значны ўклад». Лілія Ананіч заўважыла, што XXI стагоддзе выклікала патрэбнасць у электроннай кнізе, «але ўсё роўна мы з хваляваннем ставімся да новых кніг, перавыдаём старыя кнігі». «Кніга — гэта тое, што застанецца на вякі, тое, чым будуць ганарыцца будучыя пакаленні», — падкрэсліла першы намеснік міністра. На кожнага жыхара Беларусі ў 2009 годзе прыпала амаль 6 новых кніг. Такую лічбу назвала першы намеснік міністра інфармацыі Лілія Ананіч, выступаючы на брыфінгу на XXIII Маскоўскай міжнароднай кніжнай выставе-кірмашы.

Брыфінг Ліліі Ананіч адкрыў афіцыйную праграму Дня Беларусі, які праходзіў учора на кірмашы. Лілія Ананіч паведаміла, што ў Беларусі дзейнічае 5 дзяржаўных выдавецтваў і 850 выдавецкіх арганізацый рознай формы ўласнасці. Пры гэтым яна падкрэсліла, што міністэрства асабліва іх не раздзяляе, таму што ўсе выдавецтвы выконваюць сацыяльна значныя задачы.

Першы намеснік міністра адзначыла, што беларуская дзяржава актыўна падтрымлівае творчасць нацыянальных літаратараў, выпуск сацыяльна значнай кнігі. Яна асабліва вылучыла створаную ў Беларусі сістэму нацыянальных падручнікаў. Развіваецца і паліграфічная галіна, прычым яе магутнасці актыўна выкарыстоўваюцца расійскімі выдавецтвамі, сказала Лілія Ананіч.

## САЦЫЯЛЬНАЕ ТАКСІ ПАЧАЛО ПРАЦАВАЦЬ У МІНСКУ

Служба сацыяльнага таксі для людзей з абмежаванымі магчымасцямі пачала працаваць у Мінску. У распараджэнні службы 10 машын з надпісам «Сацыяльная служба». Гэта аўтобусы малой умяшчальнасці «Мерседэс-Бенц-411». Таксі замацаваны за тэрытарыяльнымі цэнтрамі сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. У першую чаргу транспартныя паслугі арыентаваны на інвалідаў-калясачнікаў і інвалідаў з парушэннямі апорна-рухальнага апарату.

**БЕЛТА.**

## «Александрыя» ў Магілёве

**ААТ «Александрыйскае» Шклоўскага раёна адчыніла ў Магілёве гандлёвы цэнтр.**

1 верасня натоўпы пакупнікоў змяталі з паліцаў фірмовыя тавары адной з самых вядомых сельскіх гаспадарак на Магілёўшчыне.

— Таму што ў нас самыя нізкія цэны на мяса ў абласным цэнтры! — пахваліўся дырэктар гандлёвага цэнтра Аляксандр Еўтушэнка. — Напрыклад, рэбры каштуюць усяго 4 тысячы рублёў за кілаграм, свіныя языкі — каля 11 тысяч, грыбы-вешанкі — 7 тысяч, яблыкі — 800-900 рублёў за кілаграм.

Сваю прадукцыю гаспадарка прадае ў аграгарадку Александрыя і ў Шклове, але гандлёвы цэнтр у Магілёве — першая ўласная крама.

— Для нас гэта выгадна, і выручку дасць добрую, — патлумачыў кіраўнік ААТ «Александрыйскае» Віктар Дзюрдзь. — Мы гарантуем якасць прадукцыі і прымальныя цэны.

**Ілона ІВАНОВА.**

# З працоўным дагаворам не трымаюць

«Выязная прыёмная»

**Больш прывабныя «грашовыя» ўмовы і больш зручны рэжым працы — звычайна менавіта гэтыя акалічнасці становяцца вырашальнымі. Аднак таксама не сакрэт: часцяком перад пераходам на новае месца трэба вырашыць усе пытанні з цяперашнім наймальнікам, і якраз тут могуць узнікнуць праблемы. Адзін з прыкладаў: жанчыне, якая занятая на ўмовах бестэрміновага дагавора і пакуль знаходзіцца ў «дэкрэтным», прапануюць іншае месца. Жанчына піша заяву на звальненне па ўласным жаданні. Але чуе ў адказ: заява будзе падпісана толькі пасля выхаду з водпуску па доглядзе за дзіцем. Ці мае тут рацыю кіраўнік? Зрэшты, сітуацыя тут адназначная. Жанчыну «на працоўным дагаворы» трымаць да заканчэння сацыяльнага водпуску ніхто не мае права. І яе звальненне з арганізацыі павінна адбыцца максімум праз месяц пасля падачы адпаведнай заявы.**

**Між тым, ад чаго залежыць перыядычнасць павышэння заробкаў у сельгасарганізацыі, калі можна патрабаваць працягу працоўнага кантракту, і што можа чакаць работнікаў у выніку аб'яднання двух прадпрыемстваў? Усё гэта стала тэмамі для размовы падчас «выязной прыёмнай», якая была наладжана дэпартаментам дзяржаўнай інспекцыі працы для жыхароў Вілейскага і Мядзельскага раёнаў.**

### Заробкі вызначаюцца наймальнікам

*Невысокі памер заробкаў у сельгасвытворчасці — факт вядомы. І тым не менш вось сітуацыя: у СВК не павышаўся памер тарыфнай стаўкі I разраду на працягу... апошніх чатырох гадоў. Ці няма тут з боку наймальніка якіх-небудзь парушэнняў?*

— Наймальнік мае толькі адзін абавязак — пры ўмовах занятасці поўны дзень і выкананні нормаў выпрацоўкі плаціць работніку зарплату не менш за «мінімалку», — адзначае **начальнік упраўлення кантролю і нагляду дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы Алена КАМІСАРАВА**. — А вось што да змянення тарыфнай стаўкі I разраду, то ніякіх агульных патрабаванняў тут няма. Умовы аплаты працы вызначаюцца наймальнікам, і ў гэтым выпадку ўсё залежыць выключна ад фінансавых магчымасцяў арганізацыі.

### «Нагрузка» больш. А грошы?

*Яшчэ адзін няпросты выпадак: даяркам на ферме даюць «дадатковую нагрузку» — падборку кармоў. Ці павінны плаціць за гэта дадатковыя грошы?*

— Калі падборка кармоў была вызначана ў службовых абавязках даяркі, то гаворкі аб дадатковай аплаце тут быць не можа, — распавядае Алена Камісарава. — Іншая справа, калі падборкі кармоў у функцыянальных абавязках няма. У такім разе гаворка ідзе аб змяненні істотных умоў працы, і тут магчымыя варыянты: паводле дамоўленасці з наймальнікам даярка або пагаджаецца на дадатковую нагрузку без аплаты, або пагаджаецца з аплатай, або не пагаджаецца і звальняецца — з выплатай выходнай дапамогі ў памеры сярэдняга заробку за два тыдні.

*І зноў жа да тэмы сельскай гаспадаркі. Механізатарам, якія працавалі на жніве, паставілі ўмову: працаваць без выхадных. Наколькі гэта законна?*

— Увогуле выхадныя быць павінны — як мінімум пасля шасці дзён працы, — працягвае Алена Камісарава. — Так, сапраўды: з улікам напружанага графіку падчас пасяўной гэта правіла можа змяняцца. Аднак тут таксама трэба мець на ўвазе: у любым выпадку на працягу года працоўнымі могуць быць не больш чым 12 выхадных.

### Адзіны шанц — калдагавор

*Канфлікт з кіраўніком — з'ява, на жаль, нярэдкая. Прычым наступствы тут звычайна таксама амаль «стандартныя» — рашэнне не працягваць кантракт. І часцяком нягледзячы нават на тое, што работнік мае 10 ці 20-гадовы стаж працы ў арганізацыі.*

— Нормы, якая б абавязвала наймальніка тлумачыць работніку прычыны рашэння не працягваць з ім кантракт, сёння ў заканадаўстве не існуе, — нагадвае Алена Камісарава. — Тым не менш яшчэ ў 2004 годзе пастановай Савета Міністраў было рэкамендавана вызначаць гарантыі па працягу кантрактаў з работнікамі, якія маюць працяглы стаж у арганізацыі і пры гэтым не маюць парушэнняў працоўнай дысцыпліны. Такім чынам, калі такая гарантыя ў калдагаворы ёсць, то забяспечыць яе наймальнік павінен. І, дарэчы, варта заўважыць: неяк перашкаджаць работніку знаёміцца з калектыўным дагаворам сваёй арганізацыі ніхто не мае права.

### Спазненне «кампенсуецца» праз суд

*Звальненне — нібыта заўсёды кропка. Аднак у любым правіле бываюць выключэнні, і калі-нікалі не самыя прыемныя. Напрыклад, здараецца: работнік пакідае арганізацыю, а потым... чакае канчатковага разліку.*

— Правесці канчатковы разлік наймальнік абавязаны ў апошні дзень працы, у адваротным выпадку за кожны дзень «спазнення» работнік можа атрымаць свой сярэдні заробак, — зазначае Алена Камісарава. — Аднак запатрабаваць ад наймальніка такія выплаты сам работнік не зможа — дзеля гэтага трэба звярнуцца ў суд. І прычым на працягу трох месяцаў пасля звальнення.

### Аналізы «дыягназ» не пацвердзілі...

*Нетыповы выпадак, і тым не менш. Па падазрэнні ва ўжыванні «моцных» напояў вадзіцеля аўтобуса адхіляюць ад работы. Вадзіцель не пагаджаецца і здае на аналіз крыві. Прычым аналіз паказвае: алкаголю ў крыві не было.*

— У такім выпадку адхіленне ад работы з'яўляецца незаконным, і за ўсе дні адхілення работніку выплачваецца яго сярэдні заробак, — падкрэслівае Алена Камісарава. — Прычым, каб падобнае не паўтаралася, таксама нялішне заўважыць: медагляд можа праводзіць толькі медыцынскі работнік. А сама па сабе выснова аб знаходжанні ў стане алкагольнага ап'янення павінна быць пацверджана дакументальна.

### Аб'яднанне з варыянтамі

*Аб'яднанне двух прадпрыемстваў — справа амаль што звычайная. Аднак тут жа з'яўляецца пытанне: што можа быць пасля гэтага аб'яднання з работнікамі?*

— У дадзеным выпадку можа быць некалькі варыянтаў, — распавядае Алена Камісарава. — Па-першае, існуе верагоднасць, што работнікам захаваюць усе ранейшыя ўмовы працы — у тым ліку пасады, службовыя абавязкі, заробкі. Варыянт другі: работнікаў пакідаюць, але на іншых умовах. У такім выпадку работнік павінен вырашыць: застацца на аб'яднаным прадпрыемстве ці не. І калі намеру застацца няма, то работніку выплачваецца выхадная дапамога ў памеры яго сярэдняга трохмесячнага заробку.

*Між тым практыка сведчыць: рэарганізацыя прадпрыемства можа мець яшчэ адзін вынік — страту дакументаў. Такім чынам, перад работнікамі прадпрыемства паўстае цяжкавырашальная праблема аднаўлення звестак, неабходных для прызначэння пенсіі.*

— Калі высветліцца, што ні ў правапераймальніка арганізацыі, ні ў архіве, ні ў райвыканкаме дакументаў аб стажы і заробках сапраўды няма, то застаецца адно — звяртацца ў суд, — раіць Алена Камісарава. — З тым, каб суд вызначыў перыяды працы і заробкі па нейкіх ускосных звестках або па сярэдніх зарплатах па аналагічных пасадах у іншых арганізацыях. Прычым самастойна шукаць інфармацыю аб сярэдніх зарплатах не абавязкова — паводле хадайніцтва зрабіць гэта можа той жа суд.

**Сяргей ГРЫБ,** Вілейскі раён.

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### БАРАЦЬБА З КАРУПЦЫЯЙ У РАСІІ ІДЗЕ ТОЛЬКІ НА СТАРОНКАХ ГАЗЕТ

**Інтэнсіўнасць барацьбы з карупцыяй у Расіі павысілася апошнім часам толькі ў прэсе, але не на справе, нягледзячы на абвешчаную Мядзведзевым антыкарупцыйную кампанію.**

Навуковы цэнтр супрацьдзеяння карупцыі НДІ Расійскай прававой акадэміі прааналізаваў крымінальную і судовую статыстыку па карупцыйных артыкулах за той жа перыяд. Як высветлілася, на справе падобных злачынстваў раскрываецца столькі ж, колькі звычайна. Пакаранні таксама застаюцца нязменнымі на працягу апошніх гадоў. Максімальная мера пакарання за злоўжыванне паўнамоцтвамі, якая прадугледжвае ад трох да пяці гадоў пазбаўлення волі, за апошнія два гады наогул не прымянялася. А максімальнае пакаранне за хабарніцтва (ад пяці да васьмі гадоў) атрымалі летась толькі чацвёра. Між тым прэм'ер-міністр Уладзімір Пуцін у адным з нядаўніх інтэрв'ю падчас нашумелага аўтапрабегу па Далёкім Усходзе падкрэсліў, што, на яго думку, барацьба вядзецца дастаткова эфектыўна: караюць як тых, хто бярэ хабары, так і тых, хто іх дае. Аднак за час актыўнай барацьбы з гэтай праблемай сярэдні памер хабару дзіўным чынам павялічыўся да 44 тысяч рублёў, у той час як яшчэ ў студзені 2010 ён складаў 23 тысячы рублёў, і гэта было амаль у 2,5 раза больш, чым у 2008 годзе.

### НАМЕСНІК КІРАЎНІКА УУС НА МАСКОЎСКІМ МЕТРАПАЛІТЭНЕ ПАГАРЭЎ З-ЗА ПАДНАЧАЛЕНЫХ — ГВАЛТАЎНІКОЎ

Кіраўнік Маскоўскай міліцыі звольніў намесніка начальніка УУС на метрапалітэне і даручыў правесці праверку ў падраздзяленнях гэтай структуры. Гэтыя меры звязаныя з выкраданнем і згвалтаваннем 30-гадовай грамадзянкі Беларусі, у якім удзельнічалі супрацоўнікі транспартнай міліцыі. Раней паведамлялася, што ў сталіцы за гэта затрыманыя чатыры чалавекі, у тым ліку двое ўжо былых супрацоўнікаў МУС.

### ПОЛЬШЧА ЗАМАХВАЕЦЦА НА КАВАЛАК ТРУБЫ «ГАЗПРАМА»

Улады Польшчы ўслед за краінамі Прыбалтыкі хочуць адхіліць «Газпрам» ад кіравання яго газаправодам, які праходзіць праз тэрыторыю краіны. У рамках рэалізацыі палажэнняў Трэцяга энергапакета ЕС Польшча прапануе перадаць мясцовы ўчастак газаправода «Ямал—Еўропа» пад кантроль дзяржаўнай Gaz-System, піша газета «Камерсант». Еўракамісія патрабуе ад Польшчы прывядзення ўмоў эксплуатацыі мясцовага ўчастка расійскага газаправода «Ямал—Еўропа» ў адпаведнасць з Трэцім энергапакетам ЕС.

### НАВУКОЎЦЫ ПРЫЗНАЛІ БАБУЛЬ БЕСКАРЫСНЫМІ ІСТОТАМІ?

Існаванне жанчын пасля надыходу менапаўзы эвалюцыйна нявыгаднае. Да такой сенсацыйнай высновы прыйшла Ганна Кахель з Інстытута эвалюцыйнай антрапалогіі імя Макса Планка (ФРГ). А з пункту гледжання дарвінізму, бабулі нават прагражаюць тэорыі натуральнага адбору, паколькі клопат аб іх паглынае і без таго бедныя рэсурсы сям'і, якія можна было б накіраваць на вырошчванне пладавітага патомства. Да гэтага часу лічылася, што бабулі — гэта велізарная дапамога ў выхаванні дзяцей. Бо, па-першае, у іх ёсць вольны час, а па-другое, вялікі досвед. Аднак Кахель сваімі новымі даследаваннямі паставіла ўсе папярэднія вынікі пад сумненне. Яна распрацавала камп'ютарную мадэль эвалюцыі працягласці жыцця ў залежнасці ад шэрагу ўмоў. І высветлілася, што дзейнасць бабуль ніяк не ўплывае на канчатковы вынік. Інакш кажучы, працягласць жыцця і здароўе чалавека абсалютна не звязаныя з тым, ці выхоўвала іх у дзяцінстве бабуля. Таксама, паводле слоў Кахель, тысячы гадоў існавання бабуль прывялі да скарачэння рэпрадуктыўнага перыяду і павелічэння ўзросту, у якім жанчыны нараджаюць першае дзіця. У гіпотэзе эвалюцыйнай карысці бабуль усумніліся яшчэ ў 2003 г. Навукоўцы сутыкнуліся з двума дзіўнымі фактамі. Па-першае, у сем'яў з жывымі бабулямі і дзядулямі нашчадкаў было менш. А па-другое, станоўчы ўплыў на малых аказвалі толькі бабулі па мацярынскай лініі. Калі ж унукаў даглядала бабуля з боку бацькі, то дзеці не дажывалі і да пяці гадоў.

# ТЫТУНЬ, АЛКАГОЛЬ ПЛЮС... «ХЛАМ» ДЛЯ ВЫТВОРЦАЎ

**Грамадзяне і юрасобы, якія парушылі мытнае заканадаўства ў Беларусі, Расіі і Казахстане, цяпер могуць быць прыцягнутыя да крымінальнай ці адміністрацыйнай адказнасці ў любой з трох краін. Аб гэтым паведаміў начальнік упраўлення па барацьбе з кантрабандай і адміністрацыйнымі мытнымі правапарушэннямі Дзяржаўнага мытнага камітэта Андрэй МІХАЛЬКЕВІЧ.**

### «Малочныя войны» ў мінулым?

Вынікам стварэння Мытнага саюза Беларусі, Расіі і Казахстана сталі па-сапраўднаму значныя змены. У прыватнасці, гэта датычыцца ўмоў перамяшчэння праз мяжу тавараў для асабістага карыстання. Як нагадаў **намеснік начальніка ўпраўлення арганізацыі мытнага кантролю ДМК Андрэй Планін**, калі раней грамадзяне Беларусі маглі ўвозіць і без мыты тавары для асабістага карыстання агульным коштам да 1000 еўра і вагай да 35 кілаграмаў, то цяперашнія «ліміты» — 1500 еўра і 50 кілаграмаў адпаведна. Значная лібералізацыя адбылася і ў адносінах да наяўнай валюты. Раней патрабавалася пісьмовае патрабаванне пры яе вывазе больш чым на 3 тыс. долараў у эквіваленце, прычым пры вывазе больш чым 10 тыс. долараў у эквіваленце было неабходна прадставіць дазвольныя дакументы. На сёння без дэкларавання можна вывозіць да 10 тыс. долараў у эквіваленце, а панядзе дазвольных дакументаў увогуле знікла. Нарэшце, таксама адметна: «ліміт» бязмытнага ўвозу алкагольнай прадукцыі ўзрос з 2 да 3 літраў.

Што ж да юрыдычных асобаў, то яны атрымалі яшчэ большыя перавагі. Сёння тавары, выраблены ў Беларусі, Расіі і Казахстане, могуць перамяшчацца ўнутры Мытнага саюза без мытных аперацый і мытнага кантролю. Такім чынам, па сутнасці айчынныя вытворцы атрымалі магчымасць бесперашкоднага выхаду на вялікія па аб'ёмах спажывання рынкі. Прычым, заўважыў Андрэй Планін, у рамках Мытнага саюза распачалася ўніфікацыя гэтак званых «тэхнічных бар'ераў» — сертыфікацыі і санітарна-гігіенічнай рэгістрацыі. У выніку з цягам часу для паставак прадукцыі ў Расію і Казахстан неабходнасці праходзіць сертыфікаванне ў гэтых краінах ужо не будзе. Інакш кажучы, стануць немагчымыя тыя ж «малочныя войны».

### Два бакі транзіту

Абсалютная большасць экспертаў перакананая, што Мытны саюз стане штуршком для развіцця нацыянальных эканомік трох дзяржаў. Актывізацыя адбываецца ўжо сёння: за апошнія месяцы назіраецца ажыўленне знешнеэканамічнай дзейнасці і перамяшчэння праз межы. Паводле звестак спецыяльнай мытнай статыстыкі, аб'ём транзітных тавараў, якія перавозяцца аўтатранспартам праз Беларусь, у гэты момант на 23 працэнты перавышае паказчык за аналагічны перыяд мінулага і на 4 працэнты — за аналагічны перыяд «дакрызіснага» 2008 года.

Разам з тым, адзначыў начальнік упраўлення па барацьбе з кантрабандай і адміністрацыйнымі мытнымі правапарушэннямі ДМК Андрэй Міхалькевіч, пасля павелічэння мытнай тэрыторыі становяцца больш актуальнымі пытанні эканамічнай бяспекі. Асабліва калі ўзяць пад увагу пэўныя праблемы з кантролем на казахстанска-кітайскай мяжы.

Пакуль казаць аб абвастрэнні аператыўнай сітуацыі ў сувязі са стварэннем Мытнага саюза не выпадае. Аднак у ДМК канстатуюць: у параўнанні з мінулым годам значна ўзрасла кантрабанда тытунёвых вырабаў (з пачатку года затрымана ўжо больш за 100 млн «шэрых» цыгарэт), алкаголю і наркотыкаў (зноў жа з пачатку гэтага года затрымана 942 кілаграмы наркатычных і псіхатропных прэпаратаў — летась гэты паказчык складаў усяго больш за 1 кілаграм). І ў сваю чаргу, гэта можна звязваць са з'яўленнем Мытнага саюза — не сакрэт, што аднымі з традыцыйных шляхоў перамяшчэння опіумных наркотыкаў з'яўляюцца Казахстан і Расія.

Апроч таго, з'явіліся і чыста эканамічныя праблемы. У сувязі з фінансавым крызісам ва ўсім свеце назапасілася вялікая (на суму больш 500 млрд долараў) колькасць неліквіднага энергетычнага, медыцынскага і іншага абсталявання. Цяпер робяцца актыўныя спробы прадаць частку гэтага састарэлага абсталявання на тэрыторыі Мытнага саюза, і ў тым ліку — пад маркай новага, з «перапісваннем» суправаджальнай дакументацыі. Што ж да эканамічнага ўрону, то тут ён можа быць значным — па некаторых здзелках да 7 мільёнаў долараў.

### З'явіцца агульны... «чорны спіс»?

Адзін са сродкаў супраць парушэння заканадаўства — умацаванне вонкавых межаў Мытнага саюза, а таксама шчыльнае супрацоўніцтва паміж праваахоўнымі органамі трох краін. Пры гэтым, заўважыў Андрэй Міхалькевіч, будзе звяртацца асаблівая ўвага на спробы ўвозу камерцыйных партый тавараў пад выглядам асабістай маёмасці грамадзян.

У той жа час ужо сёння зразумела: для гарантавання бяспекі спатрэбяцца і іншыя крокі. Так, адным з перспектыўных напрамкаў тут можа стаць пераход да дзяржзакупак па больш празрыстай схеме электронных аўкцыёнаў. А плюс да таго, на думку **начальніка ўпраўлення па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі МУС Беларусі Эдуарда НІКІЦІНА**, у бліжэйшы час тром дзяржавам — удзельніцам Мытнага саюза неабходна наладзіць абмен звесткамі аб нядобрасумленных суб'ектах гаспадарання. Прычым такі абмен павінен адбывацца ў рэжыме on-line.

**Сяргей ГРЫБ.**

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 03.09.2010 г. (для б/н разлікаў)

| | | | |
|---|---|---|---|
| 1 долар ЗША | 3 015,00 | 1 чэшская крона | 156,05 |
| 1 еўра | 3 853,47 | 1 польскі злоты | 971,80 |
| 1 латвійскі лат | 5 441,75 | 1 расійскі рубель | 98,25 |
| 1 літоўскі літ | 1 117,10 | 1 украінская грыўня | 381,40 |

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ

| | |
|---|---|
| USD | 30,6858 |
| 10 UAH | 38,8969 |
| 1000 BYR | 10,1743 |
| EUR | 39,2901 |

Агенцтва Уладзімера Грачова

Пытальнік

## ЯК ВЫЙСЦІ НА «ПЕНСІЙНЫ МАКСІМУМ» ПА СТАЖЫ?

***— Падчас паведамленняў аб пераразліку працоўных пенсій з 1 жніўня прагучала інфармацыя, што адной з умоў прызначэння максімальнай пенсіі па ўзросце з'яўляецца наяўнасць вельмі працяглага стажу: 40 гадоў у жанчын ці 45 гадоў у мужчын. Адсюль з'явілася пытанне: ці рэальна ўвогуле запрацаваць такі стаж?***

**В.М. НОВАК**, *Пінскі раён.*

Як заўважыла ў гутарцы з карэспандэнтам «Звязды» **начальнік аддзела развіцця пенсійнай сістэмы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Таццяна ПАГОНЫШАВА**, перш-наперш трэба мець на ўвазе наступнае: права на поўную пенсію па ўзросце мужчынам дае 25-гадовы, а жанчынам — 20-гадовы стаж. Што ж да 45 і 40-гадовай «умовы», то яна зусім неабавязковая. Проста ў нашым заканадаўстве зафіксавана: пры вызначэнні памеру пенсіі ў мужчын улічваецца максімум 45, а ў жанчын — 40 гадоў.

Разам з тым статыстыка сведчыць: амаль 14 працэнтаў атрымальнікаў пенсій па ўзросце і па выслузе гадоў маюць менавіта максімальны стаж. У прыватнасці, гаворка пра пенсіянераў, якія пачалі працоўную дзейнасць або працягнулі навучанне ў сярэдніх спецыяльных установах і ПТВ у 15-гадовым узросце; а таксама пра асобаў, якім вылічаны стаж у льготным парадку — скажам, пра ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны і ўдзельнікаў баявых дзеянняў пры выкананні інтэрнацыянальнага абавязку. Плюс да таго, адзначыла Таццяна Пагонышава, у пэўных варунках «вывесці» на максімальны стаж можа і праца пасля дасягнення агульнага пенсійнага ўзросту. Аднак тут нялішне заўважыць: перыяд працы пасля дасягнення агульнаўсталяванага пенсійнага ўзросту можа быць залічаны ў стаж толькі тады, калі падчас такой працы чалавек добраахвотна адмовіцца ад атрымання пенсіі.

АУКЦИОНЫ ПО ПРОДАЖЕ КОММЕРЧЕСКОЙ НЕДВИЖИМОСТИ

WWW.RLT.BY

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**КУП «Минский областной центр учета недвижимости» (организатор аукциона) по поручению Мядельского райпо (продавец)**

проводит открытый аукцион по продаже здания магазина (инв. № 633/С-7856), об. пл. 93,2 кв.м, в т.ч. кирпичная пристройка (8 м²); блочный склад (60 м²); дощатый сарай (6 м²); уборная, расположенных по адресу: **Минская обл., Мядельский р-н, Мядельский с/с, д. Никольцы.**

**Начальная цена с НДС – 60 000 000 бел. руб.**

Площадь земельного участка – **0,0660 га.**

**Задаток 10 % от начальной цены перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, УНП 690324015 КУП «Минский областной центр учета недвижимости».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) дней со дня проведения аукциона, **если иное не предусмотрено договором купли-продажи.**

Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

Аукцион состоится **05.10.2010 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления

# БЕЛАРУСЬ МАЕ НАМЕР ПАГЛЫБЛЯЦЬ ГАНДЛЁВА-ЭКАНАМІЧНЫЯ АДНОСІНЫ З ПАЛЕСЦІНАЙ

Аб гэтым заявіў кіраўнік беларускай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка ўчора на сустрэчы з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Палесціны ў Беларусі Мунтасерам Абу Зейдам з нагоды завяршэння яго дыпламатычнай місіі ў нашай краіне, перадае **БЕЛТА**.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў: «Самая непрыемная місія Прэзідэнта, калі расстаешся з паслямі, асабліва са сваімі сябрамі. Калі б у нас усе паслы замежных дзяржаў былі, як Вы, у нас, напэўна, не было б праблем ва ўзаемаадносінах з іншымі краінамі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт адзначыў, што Мунтасер Абу Зейд вельмі шмат зрабіў у апошнія тры гады, калі быў дуаенам дыпламатычнага корпуса ў Беларусі. «Я ўдзячны Вам за гэту пазіцыю. Ведаю, што Вы застаяцеся ў дыпкорпусе Палесціны, і вельмі спадзяюся, што будзеце памятаць пра Беларусь, тут Вы правялі нямала часу і працавалі эфектыўна», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. «Упэўнены, што недалёкі той час, калі нашы адносіны выйдуць на яшчэ больш высокі ўзровень. Думаю, Вамі закладзена добрая аснова, каб паглыбіць нашы гандлёва-эканамічныя адносіны. Можаце быць упэўнены: Беларусь заўсёды будзе прытрымлівацца той лініі, якой і прытрымлівалася апошнім часам». Мунтасер Абу Зейд у сваю чаргу сказаў: «Хачу перадаць падзяку кіраўніцтва Палесціны за вашу прынцыповую пазіцыю, што датычыцца палесцінскай праблемы». Ён адзначыў, што Беларусь, якую ён любіць, стала для яго другой радзімай.

## Да ведама дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь

У адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб скліканні пазачарговай сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь» пятая пазачарговая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання пачне сваю работу 7 верасня 2010 года ў 10 гадзін у зале пасяджэнняў Палаты прадстаўнікоў (Дом Урада, Авальная зала).

Рэгістрацыя дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў будзе праводзіцца 7 верасня 2010 года з 9.00 да 9.50 у фае залы пасяджэнняў.

## ПАЛЯВАННЕ РАСПАЧАЛОСЯ, ПАЛЯВАННЕ — НАПЕРАДЗЕ

**Згодна з Правіламі вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання, у краіне распачаўся асенні сезон палявання на лася і высакароднага аленя. Доўжыцца ён будзе да канца месяца — па 30 верасня.**

У светлы час сутак зброевым спосабам з засады, з падыходу, з падабліваннем дазваляецца здабываць дарослых самцоў трафейнай якасці і селекцыйных жывёл любога полу і ўзросту. Па 30 верасня працягнецца і летне-асенні сезон палявання на дзіка, калі з 18 да 9 гадзін можна паляваць зброевым спосабам з засады, з падыходу на дзіка: дарослых самцоў старэй за два гады і маладняк да двух гадоў любога полу. Да гэтай жа даты і пры выкананні тых жа ўмоў можна здабываць таксама еўрапейскую казулю: дарослых самцоў трафейнай якасці і селекцыйных жывёл любога полу і ўзросту. А з 4 верасня (першай суботы месяца) «стартуе» і летне-асенні сезон палявання на рабчыка і шэрую курапатку. Па другую нядзелю снежня ў светлы час сутак зброевым спосабам з падыходу, з засады, з падабліваннем можна будзе паляваць на птушак любога полу і ўзросту.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## У БЕЛАРУСІ ТАРЫФЫ НА ПАШТОВЫЯ ПАСЛУГІ З 1 ВЕРАСНЯ ПАВЫШАНЫ Ў СЯРЭДНІМ НА 10 ПРАЦЭНТАЎ, ЭЛЕКТРАСУВЯЗІ — НА 7,1 ПРАЦЭНТА

У Беларусі тарыфы на паслугі паштовай сувязі агульнага карыстання, што аказваюцца насельніцтву, юрыдычным асобам і індывідуальным прадпрымальнікам, павышаны з 1 верасня ў сярэднім на 10 працэнтаў, тарыфы на паслугі электрасувязі — у сярэднім на 7,1 працэнта. Аб гэтым паведаміла **БЕЛТА** ў прэс-службе Міністэрства эканомікі, каментуючы пастанову Міністэрства эканомікі ад 18 жніўня 2010 года № 215 «Аб унясенні змяненняў у пастанову Міністэрства эканомікі Рэспублікі Беларусь ад 15 мая 2008 г. № 105».

Прыкладна ў такіх самых памерах павышаны тарыфы на вышэйпералічаныя паслугі, што аказваюцца юрыдычным асобам і індывідуальным прадпрымальнікам. Пры гэтым у Міністэрстве эканомікі падкрэслілі, што ўзровень тарыфаў за мясцовыя і міжгародняя тэлефонныя размовы, установіку тэлефона і паслугі тэлеграфа засталіся на ранейшым узроўні. Паводле звестак прэс-службы, у адпаведнасці з заканадаўствам Міністэрства эканомікі ажыццяўляе рэгуляванне тарыфаў на паслугі сувязі агульнага карыстання на пераліку, зацверджаным пастановай Савета Міністраў ад 31 сакавіка 2004 года № 357.

Гэты дакумент Мінэканомікі прыняло пасля разгляду прапановы Міністэрства сувязі і інфарматызацыі па павышэнні тарыфаў на асобныя паслугі электрасувязі і паштовай сувязі агульнага карыстання, дзеючых са снежня 2009 года. Неабходнасць павышэння тарыфаў на гэтыя паслугі абумоўлена іх стратнасцю. Такім чынам, тарыф на перасылку паштовай карткі павышаны на Br20 і ўстаноўлены ў памеры Br250, тарыф на перасылку простага пісьма масай да 20 г узрос на Br30 і ўстаноўлены ў памеры Br320. Абанементная плата для насельніцтва за карыстанне тэлефонам на сетках, пераведзеных на пачасовую сістэму аплаты, павышана на Br500 і ўстаноўлена ў памеры Br2900 за месяц, на сетках, не пераведзеных на пачасовую сістэму аплаты, — павышана на Br600 і ўстаноўлена ў памеры Br4200 за месяц. Абанементная плата за радыёкропку ўстаноўлена ў памеры Br800 за месяц.

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і работнікі Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў выказваюць глыбокае спачуванне дэпутату Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання Анікеевай Людміле Аляксандраўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — **смерцю БРАТА**.

Работнікі Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне галоўнаму спецыялісту Рэдакцыйнага ўпраўлення Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў Гулевіч Алене Яўгенаўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — **смерцю МАЦІ**.

## МІЛІЦЫЯНЕРЫ ПАБІЛІ НАСТАЎНІКАЎ...

**І былі не правы.**

У пракуратуры Віцебскай вобласці шукаюць сведкаў інцыдэнту, калі супрацоўнікі міліцыі, камандзіраваныя ахоўваць парадак на час «Славянскага базару ў Віцебску», перавысілі службовыя паўнамоцтвы і пабілі грамадзян, сярод якіх была і жанчына.

— Гэта адбылося ў ноч з 16-га на 17 ліпеня а першай гадзіне падчас мінулагодняга міжнароднага фестывалю мастацтваў. На кантрольна-прапускным пункце, устаноўленым на вуліцы Леніна ў Віцебску ля дома № 17, супрацоўнікі палка міліцыі спецыяльнага прызначэння спынілі падчас асабістага агляду грамадзяніна, пры якім была 1, 5-літровая бутэлька піва. Так, у месцы правядзення масавых акцый забаронена праносіць спіртное, што і растлумачылі міліцыянеры грамадзяніну. Апошні адышоў ад месца агляду і выкінуў бутэльку ў сметніцу. І паспрабаваў зноў разам са сваёй жонкай і сябрамі прайсці праз КПП, — расказвае «Звяздзе» **Дзяніс АЛЯКСЕЕНКА, следчы следчага аддзела пракуратуры Віцебскай вобласці (па горадзе Віцебску)**. — Але міліцыянеры абвінавацілі мужчыну ў тым, што ён нецвярозы. І на аснове гэтага не хацелі пускаць у эпіцэнтр фестывальных падзей. Мужчына, дарэчы, настаўнік, пачаў абурацца. Міліцыянеры адвязлі яго ўбок — пад арку дома № 17 і пачалі біць... За мужчыну заступіўся брат ягонай жонкі, якая таксама стала сведкай інцыдэнту. Дасталася і ёй. І яна, і брат, дарэчы — таксама настаўнікі. Як высветлілася потым, міліцыянеры затрымалі, на іх погляд, парушальнікаў парадку, якіх адвезлі да нарколага, каб пацвердзіць стан алкагольнага ап'янення тройцы, склалі — з парушэннямі — акт затрымання двух мужчын і жанчыны...

Следчы адзначыў, што, дарэчы, наркалагічная «праверка» не пацвердзіла тое, што затрыманыя былі ўжо вельмі нецвярозыя. Так, выпілі, але параўнальна няшмат. Грамадзяне потым за ўласны кошт «зафіксавалі» пабоі ў судова-медыцынскай экспертызе. Яны шчыра спадзяюцца на тое, што міліцыянеры будуць пакараны па ўсёй строгасці. Двух міліцыянераў, дарэчы, ужо трохі пакаралі — за свае дзеянні атрымалі вымовы па месцы работы...

Пакрыўджаныя імі спадзяюцца на больш суровае пакаранне. Яны не пабаяліся пасля інцыдэнту напісаць адпаведную заяву ў пракуратуру. Усе апытаныя ў пракуратуры сведкі пацвердзілі, што інцыдэнт меў месца. Але дакументальных доказаў у сведкаў няма. Пры гэтым пакрыўджаныя міліцыяй адзначылі, што сярод тых, хто чакаў асабістага агляду ля КПП, былі людзі, якія здымалі на фота і камеру тое, што адбывалася. **Просьба сведкаў інцыдэнту патэлефанаваць у пракуратуру па нумары ў Віцебску 8-0212-37-20-64.**

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## ПРЫ ЖЫРОВІЦКІМ СВЯТА-УСПЕНСКІМ МУЖЧЫНСКІМ МАНАСТЫРЫ СТВАРАЕЦЦА ЦЭНТР РЭАБІЛІТАЦЫІ НАРКА- І АЛКАЗАЛЕЖНЫХ ЛЮДЗЕЙ

Выказваем сваю просьбу да ўсіх устаноў, арганізацый і неабыякавых грамадзян аб аказанні фінансавай падтрымкі або дапамогі любымі будаўнічымі матэрыяламі.

Дабрачынны рахунак № 3135000000003 у філіяле № 422 ААТ «ААБ «Беларусбанк» г. Слонім; код 152101852, УНП 590374429; атрымальнік плацяжу — Дабрачынны фонд «Праабражэнне».

Кантактны тэлефон — Velcom (8029) 656 98 89 (Георгій, памочнік архіепіскапа Лідскага і Навагрудскага па сацыяльных пытаннях).

## Абзац

◢ Двое маленькіх дзяцей зажыва згарэлі ў доме ў вёсцы Шацк Пухавіцкага раёна. Трагедыя адбылася раніцай 1 верасня. Адыходзячы на працу, маці пакінула адных дома 4-гадовага сына і 3-гадовую дачку. За дзецьмі прыглядала бабуля, якая жыла за 70 м ад дома, дзе былі ўнукі. Перыядычна яна заходзіла да дзяцей і, пераканаўшыся, што ўсё добра, ішла да сябе. Каля 7 гадзін раніцы адзін з родзічаў выпадкова заўважыў дым з хаты, дзе былі дзеці. Туды пабегла бабуля, аднак увайсці ў памяшканне ўжо было немагчыма. Не маглі дапамагчы выратаванню і супрацоўнікі МНС, якія праз 10 хвілін пасля паведамлення прыбылі на месца трагедыі. Як выявілася, выратавальніку выклікалі толькі праз 20 хвілін пасля выяўлення пажару. Сітуацыю даследуюць праваахоўныя органы. Мяркуецца, што хата загарэлася з-за дзіцячага свавольства з агнём.

◢ **Два чалавекі атрымалі сур'ёзныя траўмы на чыгуначных пуцях 1 верасня. Ноччу на 442-м км перагону Бастуны—Беняконі грузавым цягніком траўмаваны 20-гадовы студэнт, жыхар Ліды. Ён атрымаў цяжкую чэрапна-мазгавую траўму, пераломы ступні і пляча і быў дастаўлены ў бальніцу. У той жа дзень пад манеўровы цеплавоз у раёне пуцеправода ў Маладзечне трапіў 30-гадовы жыхар Іўеўскага раёна. Ён шпіталізаваны з дыягназам «ампутацыя левай верхняй канечнасці на ўзроўні верхняй трэці пляча, траўматычны шок».**

◢ У пункце пропуску «Урбаны» на беларуска-латвійскай мяжы полацкія памежнікі сумесна з супрацоўнікамі мытні затрымалі грузавы аўтамабіль «Вольва», які накіроўваўся ў Латвію. Грамадзянін Літвы меў намер незаконна вывезці 340 пачак цыгарэт расійскай вытворчасці, схаваўшы іх у пярэдняй сценцы пад абшыўкай паўпрычэпа. Кантрабанда была выяўлена. У выніку разам з цыгарэтамі коштам каля 500 тысяч рублёў да рашэння суда затрыманы і аўтамабіль з паўпрычэпам агульным коштам 180 мільёнаў рублёў.

## Поўны абзац

◢ **Салісты венскай дзяржаўнай оперы сабралі каля 30 кг мёду з вулея, які быў устаноўлены вясной на даху опернага тэатра. У якасці пасечнікаў выступалі сапрана Ільдзіка Раймондзі і Аляксандра Райнпрэхт, тэнар Хервіг Пекарара, барытоны Альфрэд Шрамэк і Ханс-Петар Камерар. Першы ўраджай будзе прададзены з аўкцыёна 24 лістапада падчас гала-прадстаўлення ў Венскай оперы, прысвечанага біялагічнай разнастайнасці на Зямлі.**

◢ У хуткім часе на аўкцыён будзе выстаўлены 60-сантыметровы фрагмент носа статуі Свабоды. Гэты фрагмент першапачаткова ствараўся для рамонту знакамітай статуі — было зроблена чатыры варыянты фрагмента носа. Адзін з іх і насамрэч пойдзе на рамонт, адзін ужо трапіў у прыватную калекцыю, трэці — знішчаны. А вось чацвёрты будзе выстаўлены на аўкцыёне дома Guernsey's 24 верасня ў Нью-Ёрку. Стартавы кошт лота пакуль не называецца.

◢ **Брытанец узарваў сябе і туалет, спрабуючы знішчыць павука. Жонка 28-гадовага брытанца зайшла ў туалетны пакой і вельмі перапалохалася, убачыўшы там павука. Муж, які ўзброіўся спецыяльным аэразолем для знішчэння насякомых, быў накіраваны туды, дзе засеў жончын крыўдзіцель. Ён папырскаў спрэем на павука. На бяду, у гэты час у туалеце перагарэла лямпачка. Мужчына, каб праверыць стан павука, запаліў запальнічку. Аэразоль з балончыка яшчэ не развеяўся, і антыпавучыны газ узарваўся. Сіла выбуху была такой, што няшчаснага выбіла з туалетнага пакоя разам з дзвярыма. Ён атрымаў апёкі твару, цела і рук.**

◢ У адным са штатаў Бразіліі 25 вязняў умудрыліся збегчы праз каналізацыю, зняўшы унітаз. Такім чынам уцекачы выбраліся ў двор будынка, куды вяла каналізацыя. Двое з уцекачоў затрыманыя, астатнія вышукваюцца.

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*


## РУП «Витебский институт недвижимости и оценки»

- оценка имущества (недвижимость, транспорт, оборудование, бизнес, вреда от залития, пожара и р.)
- организация и проведение аукционов

### ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ГОРОДОКСКОГО РАЙПО

**ЛОТ:** Капитальное строение – пивной бар, инв. № 201/С-10246, площадь 387 кв. м, по адресу: ул. Комсомольская, 25А, Городок Витебской области, начальная цена продажи 84 759 600 рублей с учетом НДС. Для обслуживания здания выделен земельный участок площадью 0,2416 га, кадастровый номер 221850100001000046.

**Хар-ка объекта согласно техническому паспорту и справки-описания:** фундамент – ж/б блоки; стены, перегородки – кирпич; перекрытия – ж/б плиты; крыша – совмещен. рулонная; полы – плитка метлахская, бетон; проемы: окон. – простые двойн. створные, дверн. – дощатые; наружн. отделка – оштукатурено; внутр. отделка – облицов. плиткой, побелка, панели ДСП; централь. отопление – стальные трубы, чугун. радиаторы; водопровод – стальн. трубы с распред. арматурой; электроосвещение – скрытая проводка; горячее водоснабж. – стальн. трубы с распред. арматурой; канализация – чугун. трубы.

1. Аукцион состоится **4 октября 2010 в 15.00** по адресу: Витебская область, Городок, ул. Советская, 16. Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00, а 04.10.2010 г. до 12.00 по адресу: Витебск, ул. Свидинского, 4. Заключительная регистрация участников 04.10.2010 с 14.30 до 15.00 по месту проведения аукциона.

2. Аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением, разработанным в РУП «Витебский институт недвижимости и оценки». Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Порядок участия и проведения аукциона опубликован на сайте www.Ocenka.by.

**11.00, 15.30** Падарожжы са смакам.
**11.30** Прагны вандроўнік.
**12.00** Культура і кухня Лацінскай Амерыкі.
**16.00, 4.00** Спецыяльны выпуск: ежа і віно — Варун Шарма.
**19.00, 0.00** Беражыце дрэвы.
**20.00, 1.00** Даведнік для шукальнікаў прыгод.
**22.00, 3.00** Бясстрашныя падарожнікі.
**1.30** ФотаДаследчыкі.

## MTV

**5.00** Russian music.
**6.00** «Стэрэа_раніца».
**8.45** «Губка Боб квадратныя штаны».
**9.10** Вобыск і спатканне.
**9.35** Тайныя спакусы курортнага гатэля.
**10.00** Кахаць або забіць?
**10.25, 22.55** Трэндзі.
**10.55** Зоркі на далоні.
**11.25** Руская дзясятка.
**12.20, 22.45** News блок.
**12.30** Ікона відэагульняў.
**13.00** Тачку на пракачку.
**13.25** Наступны.
**13.55** Па дамах: салатыя дзеткі.
**14.20** Ужо можна.
**14.45, 18.15** Чыкі & Фрыкі.
**15.35, 16.30, 19.00, 20.00** «Подыум».
**17.20, 22.20** Серыял «Пяцёра пад сонцам».
**17.45, 21.00** Серыял «Сэкс у вялікім горадзе».
**20.30** Сяброўка Пэрыс Хілтан.
**21.30** Серыял «Клініка».
**21.55** Серыял «Мяне завуць Эрл».
**0.25** World Stage: «Rock Am Ring Highlights-2010».
**1.25** Music.

## ІНТЭР+

**7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 12.00** Навіны.
**7.10, 7.40, 8.10, 8.40** Раніца з Інтэрам.
**9.10** Бацькі, якія кормяць.
**9.20, 17.25, 0.50** Серыял «Простыя ісціны».
**10.15, 18.20, 1.45** Серыял «Свая каманда».
**10.45, 18.45, 3.30** Серыял «Суседзі».
**11.10, 20.30** Серыял «Заручальны пярсцёнак».
**12.15** Я ўсё пра Вас ведаю.
**13.05** Ключавы момант.
**13.50** Знак якасці.
**14.20, 6.00** Дак. фільм «Валерый Лявонцьеў — згублены смех».
**15.15** Маст. фільм «Калі б камяні гаварылі».
**16.40, 4.00** Судовыя справы.
**19.15, 2.15** Серыял «Танга ўтраіх».
**20.00, 3.00** «Падрабязнасці».
**22.00** Вялікая палітыка з Яўгенам Кісялёвым.
**4.00** Судовыя справы.
**4.40** Украінская топ-дваццатка.

## EUROSPORT

**4.00, 12.30, 18.45, 1.30** Тэніс. Турнір Вялікага шлема. Мужчыны. 1/4 фіналу.
**9.30, 14.15, 20.10, 1.00** Тэніс. Гейм, сэт і Матс. Часопіс.
**10.00, 14.45** Снукер. Майстарс.
**17.45** Веласпорт. Нацыянальны тур Іспаніі.
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.45** Тэніс. Турнір Вялікага шлема. Нью-Ёрк (ЗША). Жанчыны. 1/2 фіналу.

## 22.35 ФІЛЬМ ДНЯ

**«РЭСТЛЕР» (ЗША, 2008 г.)**

Пажылы прафесійны барацьбіт-рэстлер пакінуў прафесію пасля таго, як у яго здарыўся інфаркт прама на матчы. Ён спрабуе наладзіць новае жыццё. Аднак надышоў час вярнуцца на арэну, каб пазмагацца са сваім галоўным супернікам.

**Рэжысёр** — Дарэн Аранофскі. **У ролях:** Мікі Рурк, Марыса Томей, Івэн Рэйчэл Вуд.

# СУБОТА, 11 ВЕРАСНЯ

## ПЕРШЫ

**6.50** Дак. серыял «Асабнякі, дзе вяршылася гісторыя».
**7.20** Існасць.
**7.45** Дзень спорту.
**7.55** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**9.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**9.05** Слова Мітрапаліта Філарэта на дзень Адсячэння галавы Іаана Прадцечы.
**9.15** Здароўе.
**9.45** Дак. серыял «Чалавек супраць дзікай прыроды»
**10.40** «Зорнае жыццё». «Зорныя мамы».
**11.40** «OFF STAGE LIFE».
**12.10 Камедыя «Белае сонца пустыні».**
**13.45** Дак. цыкл «Невядомая версія. «Белае сонца пустыні».
**14.35** Зона Х. Вынікі тыдня.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Вакол планеты.
**16.15** «У пошуках ісціны». «Каханне і смерць Васіля Чапаева».
**17.10** «Знайсці кнігу».
**17.25** «Зямля беларуская. Вытокі».
**17.55** «Ваша лато».
**18.45** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Славянскі базар у Віцебску-2010». Майстры мастацтваў Беларусі.
**21.00** Панарама.
**21.40** «White Concert» з удзелам Лонданскага Філарманічнага аркестра, дырыжора Тыберыу Соарэ, тэнара Марыуса Манеа, спявачкі Анжэлы Георгіу.
**23.10 Баявік «Асабісты нумар».**

## АНТ

**7.00** «Суботняя раніца».
**8.00, 9.00, 16.00, 20.30** Нашы навіны.
**9.05 Серыял «Мая цудоўная нянька».**
**9.45** «Здароўе».
**10.30** «Смак».
**11.10** «Ералаш».
**11.30 Маст. фільм «Гранатавы бранзалет».**
**13.10** Тэлечасопіс «Саюз».
**13.40 Камедыя «Страхавы агент».**
**15.00** «Герман Цітоў. Першы пасля Гагарына».
**16.15, 21.00** Навіны спорту.
**16.20** «Ларыса Доліна. «Мне надакучыла быць жалезнай».
**17.20 Камедыя «Дзіця напракат».**
**18.55** Асяроддзе пражывання. «Дары восені».
**19.55** «Чакай мяне». Беларусь.
**21.05** «Дэтэктар хлусні».
**22.10** «Пражэктарперысхілтан».
**22.45 Маст. фільм «Джэры Магуайр».**
**1.05** «Ціхі дом» на Венецыянскім кінафестывалі.

## ЛАД

**7.00** «Смачна з Барысам Бурдой».
**7.30** Усё пра бяспеку.
**7.55** Нашы тэсты.
**9.00** Жаночая ліга.
**9.30** «Рэальны свет».
**10.00** Жансавет.
**10.40** «Ты — тое, што ты ясі».
**11.20, 19.50** Тэлебарометр.
**11.25** «Страсці па культуры».
**12.05 Меладрама «Блізкія людзі».**
**16.05 Серыял «Непрыгожая Бэці-2».**
**16.55** Хакей. КХЛ. Дынама (Мінск) — Лакаматыў (Яраслаўль).
**19.15** «Восеньскі жарт з...».
**19.55 Маст. фільм «Схватка ў небе».**
**21.50 Трылер «Анёл».**
**23.55** Жывы гук.

## СТБ

**6.35 «Вовачка». Серыял. Заключныя серыі.**
**7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**7.40 Маст. фільм «Як я быў вундэркіндам».**
**9.55** «Мінск і мінчане».
**10.40** «Новыя падарожжы дылетанта».
**11.10** «Крокі да поспеху».
**12.05 Маст. фільм «Нашы суседзі».**
**13.50 Маст. фільм «Давай пажэнімся».**
**15.20** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**15.45** «Відзьма-нявідзьма».
**16.50** «Наша справа».
**17.00** «Вялікі горад».
**17.45 Маст. фільм «Рыфмуецца з каханнем».**
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10 Маст. фільм «Трамвай у Парыж».**
**22.55** «Зорны рынг».
**23.55 Маст. фільм «Інсайт».**
**1.30 «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.**

## МІР

**5.00, 12.40 Серыял «Сышчык без ліцэнзіі».**
**5.50, 17.00** «Даведнік».
**6.20, 3.45** Дак. фільм «Самы вялікі нос у Барнэа».
**7.30** М/с «Тры мядзведзі».
**8.00 Серыял «Прыгоды швейцарскай сям'і Робінсанаў».**
**8.30** «Эксперыментатары».
**8.45** «Мільён пытанняў пра прыроду».
**9.00, 15.00** Навіны Садружнасці.
**9.10** «Сто пытанняў пра Садружнасць».
**9.40** «Мар, дзейнічай, будзь!».
**10.10** «Смачны свет».
**10.40** «Любімыя акцёры».
**11.00 Маст. фільм «Усё наадварот».**
**13.40, 23.35** «Доказы віны».
**14.30** «Саюзнікі».
**15.10, 21.45 Маст. фільм «Абдуладжан, або Сцівену Спілбергу прысвячаецца».**
**17.35** «Навіны Садружнасці. Культура».
**18.20, 1.00 Маст. фільм «Нявернасць».**
**20.00 Серыял «Лабірынты розуму».**
**21.00** «Асабістыя рэчы з Андрэем Максімавым».

## 8 КАНАЛ

**9.00, 9.55, 13.00, 17.55, 18.55, 21.10, 23.45** «Надвор'е».
**9.05** «Пляткарка».
**9.15, 14.45** «Мультпарад».
**9.45** «На рыбалку з Юрыем Заслаўскім».
**10.00 Драма «Кат».**
**12.45, 17.30** «Кіналабакнот».
**13.05 Меладрама «Шэрбургскія парасонікі».**
**16.00** «Адшукваецца адпачынак».
**16.30 Серыял «Дзявяты ўзровень».**
**18.00 Серыял «Абаронца».**
**19.00 Драма «Вы чые, старыя?».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05** «К-гульні» — «Лайт».
**21.15 Трылер «Тэорыя змовы».**

## ВТБ

**6.00, 23.00** «Play».
**11.30, 18.00, 22.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**13.00 Серыял «Татавы дочкі».**
**15.30** «Coldplay — лепшае музычнае відэа».
**16.00 Камедыя «Дзіўныя сваякі».**
**20.00 Баявік «Ван Хельсінг».**

## РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00 Маст. фільм «Прызначэнне».**
**8.30 Камедыя «Шэкспіру і не снілася...».**
**10.25** «Ранішняя пошта з Ларысай Грыбалёвай».
**11.00, 14.00** Весткі.
**11.10** «Суботнік».
**11.50 Маст. фільм «Я падару сабе цуд».**
**13.30** «Нататкі натураліста».
**14.15** «Другі. Герман Цітоў». Дак. фільм.
**15.05 Дэтэктыў «Пятроўка, 38».**
**17.00** «Суботні вечар».
**19.00** Весткі ў суботу.
**19.40** «Гарадок».
**20.15 Маст. фільм «Пастка».**
**23.40 Маст. фільм «Жанаты халасцяк».**
**1.10** «33 вясёлыя літары».

## НТБ—БЕЛАРУСЬ

**7.35** «Агляд».
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.20** «Авіятары».
**8.50** «Выратавальнікі».
**9.25** «Жывуць жа людзі».
**10.25** «Галоўная дарога».
**10.55** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.25** «Жаночы погляд». Ірэк Зарыпаў.
**14.15 Камедыя «Пра каханне».**
**16.25 Серыял «Злачынства будзе раскрытае».**
**17.20** «Вочная стаўка».
**18.

# НЯДЗЕЛЯ, 5 ВЕРАСНЯ

## ПЕРШЫ

**8.15** М/ф.
**9.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**9.05** «Арсенал».
**9.35** «Зброя».
**9.50** Альманах падарожжаў.
**10.15** «Кухар дома».
**10.50, 19.15** «OFF STAGE LIFE».
**11.05** Дак. цыкл «Невядомая версія. «Службовы раман».
**12.10 Камедыя «Службовы раман».**
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** «Зямля беларуская. Скрыжаванні».
**15.55** М/ф «Астрабой».
**17.30** Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэасапіс.
**18.05** Суперлато.
**19.30** «Мая праўда». «Алена Проклава».
**20.30** «Спартлато 5 з 36».
**20.50** «КЕНО».
**21.00** «У цэнтры ўвагі».
**22.05 Серыял «Ліквідацыя».**
**19.05 Драма «Час суніцаў».**
**21.15** Смешная часінка.
**21.45** Культпрасвет.
**22.15 Баявік «Крытычная маса».**

## АНТ

**7.00** «Нядзельная раніца».
**8.00, 9.00, 16.00** Нашы навіны.
**9.05** Нядзельная пропаведзь.
**9.20 Серыял «Мая цудоўная нянька».**
**9.55** «Бесталковыя нататкі».
**10.15** Пакуль усе дома.
**11.10** «Фазэнда».
**11.50 Камедыя «Апякун».**
**13.25 Маст. фільм «Лера».**
**15.05** «Мой радавод. Ігар Бутман».
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** «Гарады-героі. Сталінград».
**17.15 Камедыя «Масква слязам не верыць».**
**20.00** Контуры.
**21.05 Маст. фільм «Арлет».**
**22.55 Маст. фільм «Скульптар смерці».**
**0.35** «Yesterday live».

## ЛАД

**7.25** Звон.
**7.50** Мір вашаму дому.
**8.00** «Смачна з Барысам Бурдой».
**8.25** Нашы тэсты.
**9.30** Жаночая ліга.
**10.00** Школа рамонту.
**11.05** Урачэбныя тайны з доктарам А. Цярэшчанкам.
**11.50, 20.55** Тэлебарометр.
**11.55** «Ты — тое, што ты ясі».
**12.30** «Правы чалавека».
**12.45** Гаспадар.
**13.15 Камедыя «Верныя сябры».**
**15.25** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Эвертон — Манчэстэр Юнайтэд.
**17.25 Серыял «Непрыгожая Бэці-2».**
**18.15** «Неверагодныя гісторыі кахання».

## СТБ

**7.00 «Вовачка-2». Серыял.**
**7.55 Камедыя «Прэмія Дарвіна».**
**9.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Відавочца прадстаўляе: самае смешнае».
**10.50** «Вялікі сняданак».
**11.30 «Салдаты. Залатыя серыі».**
**13.15** «Добры дзень, доктар!».
**13.50 Камедыя «На спіне ў чорнага ката».**
**15.30** «Ваенная тайна».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.55** Чэмпіянат Рэспублікі Беларусь па футболе: «Днепр» (Магілёў) — ФК «Мінск».
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень».
**20.40 Камедыя «Белыя Росы».**
**22.25** Жывы канцэрт. Дзядзька Ваня і група «OneHellThing».
**23.15 Маст. фільм «Зграя».**
**1.00 «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.**

## МІР

**5.00, 12.40 Серыял «Сышчык без ліцэнзіі».**
**5.50** «Даведнік».
**6.20, 3.45** Дак. фільм «Гатэль «Ігуана».
**7.30** М/с «Тры мядзведзі».
**8.00 Серыял «Прыгоды швейцарскай сям'і Робінсанаў».**
**8.30** «АБВГДэйка».
**9.00, 15.00** Навіны Садружнасці.
**9.10** «Ведаем рускую».
**10.10** «Ахвота да змены месцаў».
**10.40** «Любімыя акцёры».
**11.00 Маст. фільм «Леў Гурыч Сінічкін».**
**13.40, 23.35** «Доказы віны».
**14.30** «Дыяспары».
**15.10, 21.40 Маст. фільм «Качка пад апельсінавым соусам».**
**17.00** Дак. фільм «Сакрэты анёлаў, дэманаў і масонаў».
**18.20, 0.25 Маст. фільм «Каралева».**
**20.00** «Разам».
**21.00, 2.25** «Паўночнікі».
**3.00** Дак. фільм з цыкла «Лубянка».

## 8 КАНАЛ

**9.00, 13.05, 17.55, 18.55, 21.10, 23.25** «Надвор'е».
**9.05** «Пляткарка».
**9.15** «Мой любімы гадаванец».
**9.45** «Мультпарад».
**10.00, 23.05** «Кінаблакнот».
**10.15** «Адшукваецца адпачынак».
**10.45 Трылер «Тэорыя зможы».**
**13.10** «Яна напісала забойства».
**15.00** «К-відэа» для дзяцей.
**15.20 Фільм для дзяцей.**
**16.30 Серыял «Дзявяты ўзровень».**
**17.30** «Бульбокс».
**18.00 Серыял «Абаронца».**
**19.00 Камедыя «Агент».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05** «К-відэа» для ўсёй сям'і.
**21.15 Трылер «Сувязі».**

## ВТБ

**6.00, 23.00** «Play».
**11.30, 18.30, 22.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**13.00 Серыял «Татавы дочкі».**
**15.30** « Дзіма Білан — лепшае музычнае відэа».
**16.00 Баявік «Ван Хельсінг».**
**20.00 Баявік «Рыцары неба».**

## РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Набытак рэспублікі».
**7.30 Дэтэктыў «Пятроўка, 38».**
**9.15 Маст. фільм «Жанаты халасцяк».**
**11.00, 14.00** Весткі.
**11.10** «Сам себе рэжысёр».
**12.05 Маст. фільм «Памяташ або забыцца».**
**14.15** «Смехапанарама Яўгена Петрасяна».
**14.45 Маст. фільм «Пастка».**
**18.05** «Смяяцца дазваляецца».
**19.00** Весткі тыдня.
**20.00** «Сумленны дэтэктыў».
**20.45 Маст. фільм «Калі б я цябе кахаў...».**
**22.50** «Спецыяльны карэспандэнт».
**23.50 Маст. фільм «Апошні забой».**

## НТБ—БЕЛАРУСЬ

**7.40** М/ф.
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00** Сёння.
**8.20** «Дзікі свет».
**8.45** «Іх норавы».
**9.25** «Ядзім дома!».
**10.20** «Першая перадача».
**10.55** «Крамлёўскія жонкі». Вікторыя Брэжнева.
**11.55** «Дачны адказ».
**13.30** «Лепшы горад Зямлі». Масква дэфіцытная.
**14.25** «Суд прысяжных: Галоўная справа».
**16.25 Серыял «Злачынства будзе раскрытае».**
**17.20** «І зноў добры дзень!».
**18.25** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**19.00** Сёння. Падагульняючая праграма.
**20.00** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.50** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**22.00 Серыял «Дарожны патруль».**
**23.55** «Футбольная ноч».
**0.20** «Асабліва небяспечны!».

## ТНТ

**5.00** «Сапраўдныя монстры». М/с.
**6.00** «Котасабака». М/с.
**7.25, 4.40 Серыял «Саша + Маша».**
**7.55 Серыял «Сябры».**
**8.50** Латарэі: «Першая Нацыянальная» і «Фабрыка поспеху».
**9.00** «Школа рамонту».
**10.00** «Бітва экстрасэнсаў».
**11.00** «Суперінтуіцыя».
**12.00 Прыгоды «Індзіяна Джонс: У пошуках згубленага каўчэга».**
**14.25 «Інтэрны». Сітком.**
**16.00 Прыгоды «Індзіяна Джонс і храм лёсу».**
**18.30, 21.30** «Comedy Батл».
**19.00 Прыгоды «Індзіяна Джонс і апошні крыжовы паход».**
**22.00, 1.00** «Дом-2».
**23.30** «Comedy Woman».
**0.25** «Сэкс» з Анфісай Чэхавай.
**1.55** «Камедзі Клаб».
**2.50** «Забойная ліга».
**4.05** «Забойнай ночы».

## КУЛЬТУРА

**5.30** «Ёўраньюс».
**9.10** «Звычайны канцэрт з Эдуардам Эфіравым».
**9.40 «Не было суму». Маст. фільм.**
**10.50** «Легенды сусветнага кіно». Сідні Полак.
**11.20** «Пеця і воўк». М/ф.
**11.50** «Казка пра цара Салтана». М/ф.
**12.45, 0.55** «Фарбы вады». Дак. серыял.
**13.40** «Што рабіць?».
**14.25** «Пісьмы з правінцыі». Шуя (Іваназская вобласць).
**14.55 «Ягор Булычоў і іншыя». Маст. фільм.**
**16.25** Л. Дэліб. Балет «Сільвія».
**18.15 «Валянціна». Маст. фільм.**
**19.55** Юбілейны вечар Цэнтральнага акадэмічнага тэатра Расійскай Арміі.
**20.55 «Салодкае жыццё». Маст. фільм.**
**23.55** «Джэм-5».
**1.50** Праграма перадач.

## НАСТАЛЬГІЯ

**5.00** Сустрэча з пісьменнікам Андрэем Бітавым у Астанкіна. 1989 год.
**6.10** Дак. фільм «Уладары без масак. Кроў і долары».
**7.05** «Ранішняя пошта».
**7.35** Дак. фільм «Херлуф Бідструп у Маскве».
**8.00, 14.00, 2.00** «Мінулы час».
**9.00, 3.00** «Народжаныя ў СССР».
**10.00** «Кінапанарама». 1982 год.
**11.00** «Да і пасля...». Год 1987.
**12.00** Дак. фільм «Што там, у яркай упакоўцы?».
**12.30** «Кінаканцэрт». 1987 год.
**13.30** М/ф «Чараўнік Ізумруднага горада». 4-я серыя.
**15.00 Маст. фільм «Набытак рэспублікі». 1-я серыя.**
**16.05, 22.05** «Бенефіс Таццяны Даронінай». 1980 год.
**17.00** «Спяём, сябры!».
**18.00** Фільм-канцэрт «Чатыры клоўны пад адным дахам».
**19.00** «Блакітны агеньчык». 1963 год.
**20.00** «Быў час».
**21.00 Маст. фільм «Набытак рэспублікі». 2-я серыя.**
**23.00** Дак. фільм «Цяжкае шчасце Ірыны Радніной».
**23.50** Дак. фільм «Раз, два, тры».
**0.50** «Рана раніцай». 1991 год.
**1.50** Памяці А. Меня. 1990 год.
**4.00** «Тэма». 1992 год.

## НАША КІНО

**6.30, 12.30** Драма «Справа Румянцава».
**8.30, 14.30** Камедыя «Прывітанне і бывай».
**10.30, 16.30** Меладрама «Паездка ў Вісбадэн».
**18.30, 0.30** Драма «Голас».
**20.30, 2.30** Меладрама «Мама выйшла замуж».
**22.30, 4.30** Драма «У агні броду няма».

## ДОМ КІНО

**3.00, 11.00, 19.00** Серыял «Сваты-3».
**3.50** Дэтэктыў «Дзесяць негрыцянят».
**6.05** Камедыя «Гараж».
**7.45** Меладрама «Спатканне з маладосцю».
**9.10** Фільм «Патрыятычная камедыя».
**11.50** Экранізацыя школьнай праграмы. «Галоўны сведка».
**13.00** Трагікамедыя «Культпаход у тэатр».
**14.30** Прыгодніцкі фільм «Перахоп».
**15.55** Камедыя «Дача».
**17.20** Золата «Масфільма». «Мужыкі!».
**19.55** Прэм'ера. «Скалалазка і Апошні з сёмай калыскі».
**21.25** Меладрама «Зімняя вішня».
**22.55** Дэтэктыў «Загон».
**0.30** Псіхалагічная драма «Фантазіі Фарацьева».

## ТБ1000

**9.00, 17.00, 1.00** Меладрама «Прыгажунчык».
**10.30, 18.30, 2.30** Драма «Тайна містэра Райса».
**12.05, 20.05, 4.05** Меладрама «Даруй за каханне».
**13.55, 21.55, 5.55** Драма «Калі ты апошні раз бачыў свайго бацьку».
**15.30, 23.30, 7.30** Камедыя «Быць Стэнлі Кубрыкам».

## ТБ3

**3.00, 1.00** Камедыя «Гарачае амерыканскае лета».
**5.00** Трылер «Хто Вы, Містэр Брукс?».
**7.00** Камедыя «Братц».
**9.00** Драма «Тры колеры: чырвоны».
**11.00** Камедыя «З засмучэннем у твары».
**12.30** Драма «Высокая мода».
**15.00** Камедыя «Лекар Адамс».
**17.05** Драма «Эвелін».
**19.00** Драма «Асістэнтка».
**20.35** Драма «Сакрэты Лос-Анджэлеса».
**23.00** Камедыя «Думкі, поўныя жадання».

## ТБ-21

**5.00** Дак. фільм «Сільвестр і Твіці».
**5.30** М/ф «Том і Джэры. Дзіцячыя гады».
**6.00** «Далёка і яшчэ далей».
**7.00** М/ф «Адчайныя байцы Бакуган».
**7.30** М/ф «Фостэр: дом для сяброў са свету фантазій».
**8.00** Маст. фільм «Мама Джэк».
**10.00, 2.00** Серыял «Трэцяя планета ад Сонца».
**11.00, 3.00** Серыял «Усе мае былыя».
**12.00** «Містычная планета».
**13.00** Серыял «Якая размаўляе з прывідамі».
**15.00** Маст. фільм «Фантастычная чацвёрка-2. Уварванне сярэбранага серфера».
**17.00** Дак. фільм «Не такія. Трэйсеры».
**18.00** Маст. фільм «Містар Вудкок».
**20.00** Маст. фільм «Сонцастаянне».
**22.00** Серыял «Сховішча».
**23.00** Серыял «Псі-фактар».
**0.00** Маст. фільм «Куджо».

## РАМАНТЫКА

**7.00, 18.40** «Кругасветнае падарожжа».
**7.55** «Паслухай, красуня».
**12.20, 17.50** «Смачнае захапленне+».
**13.20** «Без вестак зніклая».
**19.35, 0.55** «Анучная лялька».
**21.30** «Такое жыццё».
**22.25** «Сэм і Джэнет».
**0.00** «Неўтаймоўная Хільда».
**2.40** «Дзеля кахання Глорыі».

## DIVA UNIVERSAL

**0.10** Маст. фільм «Клуб другіх жонак».
**1.50** Маст. фільм «Бландзінка». 1-я серыя.
**3.20, 11.40** Маст. фільм «Бландзінка». 2-я серыя.
**5.00** Серыял «Дочкі Маклеода-VII».
**6.40** Серыял «Джордан расследуе-VI».
**7.30** Серыял «Сапраўдныя хатнія гаспадыні Нью-Джэрсі».
**10.00** Серыял «Дамы сям'і Гілмор».
**13.10** Маст. фільм «Клуб другіх жонак».
**14.45** Серыял «Пляткарка».
**16.20** Маст. фільм «Ганна Карэніна». Частка 2-я.
**18.20** Серыял «Добрая жонка». 7—13-я серыі.

## SY FY

**7.30** Зачараваныя.
**11.40** Фантастыка «Стоўнхэндж Апакаліпсіс».
**13.20, 23.15** Прытворшчык.
**15.00** Доктар Хто.
**16.40** Легенда пра Шукальніка.
**18.20** Пункт прызначэння — праўда.
**20.00** Жахі «Кэры 2: люстасць».
**21.45** Баявік «Мега-акула супраць гіганцкага васьмінога».
**1.45** Караткаметражныя фільмы.

## ДЗІЦЯЧЫ СВЕТ

**5.00, 9.00** Казка «Вясёлы сон або смех і слёзы». 2-я серыя.
**6.05, 10.05, 14.05** М/с «Брэменскія музыканты». М/ф: «Розныя колы», «Дзед Мароз і лета».
**7.00, 11.00** М/ф «Ключ».
**7.55, 11.55** Казка «Жаба-падарожніца». М/ф: «Пеўнік — залаты грабеньчык», «Роўна ў 3:15...», «Цімошкава елка».
**13.00, 15.00** Серыял «Прыгоды Электроніка». 2-я і 3-я серыі.
**16.05** М/с «Па слядах брэменскіх музыкантаў». М/ф: «І мама мне даруе», «Жалезныя сябры».
**17.00** Казка «Снежная каралева».
**18.00** Казка «Чарадзейны пярсцёнак». М/ф: «Бобік у гасцях у Барбоса».

## ЗДАРОЎЕ

**5.00, 18.25** Увага, ежа!
**5.30** Як Вы сябе адчуваеце?
**6.00** Калі ежа забівае.
**6.50** Я чакаю дзіця.
**7.20, 23.30** Пазнай сябе.
**7.50, 21.00** Гісторыя хваробаў.
**8.20, 21.30** Хто старэе хутчэй?
**8.50, 16.00** Хуткая дапамога.
**9.20, 16.30** Ты — тое, што ты ясі.
**9.50, 2.40** Выдаткі вытворчасці.
**10.30, 4.30** Школа розуму.
**11.00, 2.00** Набалелае пытанне.
**11.40, 4.00** Кабінет прыгажосці.
**12.10, 18.55, 1.00, 3.55** Азбука здароўя.
**12.15** Здароўе ад зоркі.
**12.55, 3.25** Цела чалавека.
**13.35** Жаночы часопіс.
**14.05** Я перамог гэты боль.
**14.35, 0.00** Правілы здароўя.
**15.00** Будзем здаровыя.
**15.30, 17.50** Памылкі здароўя.
**17.00, 1.05** Як пражыць даўжэй.
**19.00** Зялёная аптэка.
**19.30** Жыццё або Смерць?
**20.00** Нетрадыцыйная медыцына.
**20.30** Практыка здароўя.
**22.00** Пра дыеты і не толькі.
**22.30** Найноўшыя дасягненні.
**23.00** Як не страціць здароўе.
**0.30** Я расту.
**3.10** Энцыклапедыя памылак.

## ТДК

**6.00, 7.50, 10.50, 11.50, 13.00, 16.50, 17.50, 18.50, 22.00** Парады ТДК.
**6.25, 9.00, 14.30** Усё лепшае, для вас.
**7.25, 12.00, 18.00, 22.10, 5.00** Ваш доктар.
**8.00** Добрай раніцы, каханая!
**10.00, 17.00, 1.00** Красуня.
**11.00, 13.25, 2.00** Нашы дзеці.
**15.30** Латарэя «Бінга».
**15.55, 20.00** Ваш асабісты псіхолаг.
**19.00, 22.30** Люстэрка жыцця.
**21.00, 23.30** Сэксуальная рэвалюцыя.
**3.00** Гісторыя поспеху.
**4.00** Твой дом.

## DISCOVERY

**7.00** «Як працуюць машыны».
**7.30** Як гэта ўстроена?
**7.55, 15.15, 3.50** Новы свет.
**8.50, 14.20, 21.00, 2.55** Разбуральнікі легендаў.
**9.45** «Маланкавыя катастрофы».
**10.40** Амерыканскія лесарубы.
**11.35** Выжыць любой цаной.
**12.30** Дарога тарнада.
**13.25** Смяротны ўлоў.
**16.10** Скрыўленне часу.
**16.35** «Top Gear».
**18.30** Заводскія будні.
**19.00** Гром сярод яснага неба.
**20.00** «Лепшыя аўтамабілі».
**22.00** Рос Кемп.
**23.00** У турме і на чужыне.
**0.00** «11 верасня. Калі вежы ўпалі».
**1.00** «На месцы злачынства».
**2.00** Нацыя, якая адпачывае.
**4.45** «Як гэта працуе».
**5.10** Будаўнічая дапамога.
**6.05** «Дзёрзкія праекты».

## NATIONAL GEOGRAPHIC

**5.00** У аб'ектыве.
**6.00** У сэрцы джунгляў.
**7.00** Дагістарычныя драпежнікі.
**8.00** Створаныя забіваць.
**9.00** Некранутая прырода.
**10.00** Малпы-зладзюжкі.
**11.00** Мегазаводы.
**12.00** Найцяжэйшы ў свеце рамонт.
**13.00** Дзікая прырода Расіі.
**15.00** Толькі не расказвайце маме, што я... у Пакістане.
**16.00** Небяспечныя падарожжы.
**17.00** Дэтэктывы-дайверы.
**19.00, 4.00** Расследаванні авіякатастроф.
**20.00, 23.00, 2.00** Бамбардзіроўкі Германіі.
**21.00, 0.00, 3.00** Тайна горада блізнятаў.
**22.00, 1.00** З пункту гледжання навукі.

## TRAVEL

**5.00, 10.00, 14.00, 21.00, 2.00** Сусветны падарожнік.
**6.00** Па чыгунках Швейцарыі.
**7.00** Круіз у пошуках прыгод.
**8.00, 4.30** ФотаДаследчыкі.
**8.30, 12.00** Пра галоўнае.
**9.00** Лепшыя ў свеце падарожжы на матацыкле.
**11.00** Бяспечныя падарожнікі.
**12.30** Галівуд і вінаград.
**13.00, 17.00** Падарожжы сёння.
**13.30** Прагны вандроўнік.
**15.00, 19.30, 0.30** Культурны шок.
**15.30** Круасаны ў джунглях.
**16.00** Спецыяльны выпуск: ежа і віно — Варун Шарма.
**17.30** Па маляўнічых дарогах.
**18.00, 23.00** Кулінарная Азія.
**19.00, 0.00** Падарожжы вакол свету.
**20.00, 1.00** Нататкі падарожніка.
**22.00, 3.00** Сусветная адысея Джуліяна і Камілы.
**4.00** Даведнік для шукальнікаў прыгод.

## ANIMAL PLANET

**7.00** «Разбуральнікі стэрэатыпаў».
**7.25** Маёнтак сурыкатаў.
**7.50** «Самыя забаўныя жывёлы планеты».
**8.40, 1.40** Вяртанне на волю.
**9.35** На дне бездані.
**10.00, 17.20** Уводзіны ў катаводства.
**10.55** «Малпіна жыццё».
**11.20, 6.35** «Ветэрынары на маршы».
**11.50** «Паліцыя Маямі — аддзел па абароне жывёл».
**12.45** Ветэрынары-стажоры.
**13.10** «Ветэрынарная «хуткая дапамога».
**13.40** Паліцыя Фенікса — аддзел па абароне жывёл.
**14.35, 20.10** Перакладчык з сабачай.
**15.30** «Самыя нязносныя ручныя жывёлы Брытаніі».
**16.25** Уводзіны ў сабаказнаўства.
**18.15** Паліцыя Х'юстана — аддзел па абароне жывёл.
**19.10** Незвычайныя жывёлы Ніка Бейкера.
**21.05** «Джунглі».
**22.00** Кітовыя войны.
**22.55** Самыя страшныя жывёлы.
**23.50, 4.25** Акулавая прынада.
**0.45, 2.35, 5.20** Дзікія і небяспечныя.
**3.30** Я выжыў.
**6.10** Аддзел па абароне жывёл.

## EUROSPORT

**4.00, 22.00** Тэніс. Турнір Вялікага шлема. Жанчыны. Фінал.
**9.30, 12.00, 2.30** Тэніс. Гейм, сэт і Матс. Часопіс.
**9.45, 14.45, 20.15** Снукер. Майстарс. Фінал.
**12.15** Аўтаспорт. Серыя Гран-пры 3.
**12.45** Аўтаспорт. Суперкубак Поршэ.
**13.30, 18.45** Аўтаспорт. Гонкі на вынослівасць Ле-Ман.
**17.45** Веласпорт. Нацыянальны тур Іспаніі.
**20.00, 21.30** Мотаспартыўны часопіс.
**21.45** Ралі-рэйд. «Шаўковы шлях».
**23.00** Тэніс. Турнір Вялікага шлема. Мужчыны. Фінал.

## MTV

**5.00, 1.05** Music.
**6.00** Стэрэа_раніца. The Best.
**8.40** Даступны экстрым.
**9.10** «Котасабака».
**9.35** «Крутыя бабры».
**10.00** «Губка Боб».
**10.55** Наступны.
**11.45** Тачку на пракачку.
**12.35** «Легенды Галівуда. Патрык Суэйзі».
**13.30** Трэндзі.
**14.00** News блок Weekly.
**14.30** Ікона відэагульняў.
**15.00** КінаЧарт.
**15.30** «13 кіналаж».
**16.00, 21.00** American Idol.
**17.00** MTV Special: Казантып.
**19.20** «30 целаў на пляжы: прыгажуні і пачвары».
**22.00** Каралі танцпляцоўкі.
**23.00** «Рэутэў ТБ».
**23.25** «Паўднёвы парк».
**0.15** Зорны бой насмерць.

## ІНТЭР+

**7.00** Маст. фільм «Без года тыдзень».
**8.15** Украінская топ-дваццатка.
**9.35** Школа доктара Камароўскага.
**10.00** Украіна, уставай!
**10.30** Пазавочы. Г. Дэліеў.
**11.20** Канцэрт «Залатая катрынка».
**14.15** Маст. фільм «Бялее парус адзінокі». 3, 4 серыі.
**16.30** Маст. фільм «Дробязі жыцця».
**17.40** Скептык.
**18.05, 3.45** Маст. фільм «Другарадныя людзі».
**20.00, 3.00** Падрабязнасці тыдня.
**20.45, 1.10** Футбол. Прэм'ер-ліга Украіны. «Ворскла»—«Днепр».
**22.45, 5.40** Маст. фільм «Туманнасць Андрамеды».
**0.00** Гульні патрыётаў-1.

*У праграме магчымыя змяненні. Перадрукоўка праграмы забаронена!*

## БЕЛАРУСЬ РТР 23.50 ФІЛЬМ ДНЯ

### «АПОШНІ ЗАБОЙ» (Расія, 2006 г.)

Шахцёрскі гарадок у перыяд распаду Савецкага Саюза. Трое забойшчыкаў розных узростаў і пакаленняў, каб пракарміць і хоць крыху палепшыць жыццё сваіх родных і блізкіх, ідуць на адчайны крок — узрываюць сябе ў шахце. Цяпер родныя павінны атрымаць кампенсацыю. Але як гаворыцца, калі не шанцуе, то не шанцуе ні ў чым. Нават у смерці...

**Рэжысёр** — Сяргей Баброў. **У ролях:** Сяргей Гармаш, Аляксей Гарбуноў, Пётр Зайчанка.

# ІРАН: НА ВОСІ ДАБРА

**...ІСФАХАН лічыцца горадам вучоных і майстроў. Менавіта тут на другой па велічыні ў свеце (пасля кітайскай Цяньаньмэнь) плошчы Імама размешчаны комплекс найпрыгажэйшых мячэцяў, палацаў, некалькі чайных, а таксама крыты кірмаш, які смела можна назваць Горадам майстроў. Многія тавары вырабляюцца непасрэдна ў вас на вачах. Гэта датычыцца як дыхтоўнага фарфору, вырабаў з медзі і серабра, так і дываноў... Той факт, што вы іншаземец, часта ўспрымаецца не як шанц «злупіць тры скуры», а як «госцю трэба саступіць».**

Акрамя плошчы і кірмаша, абавязкова трэба наведаць самы вядомы пешаходны мост пад назвай «33 масты» праз маляўнічую раку Зайендэруд. Як я зразумеў, мост названы

У армянскім квартале.

так па колькасці пралётаў і арак. Вялікі і прыгожы. Асабліва з начной падсветкай. Прычым гэта — сапраўдная даўніна. Мост узведзены ў 1600 годзе! Праз яго можна патрапіць у армянскі квартал і наведаць хрысціянскую царкву, дзе вельмі ўражвае выстава, прысвечаная генацыду армян туркамі. Фотаздымкі і сёе-тое, што ўдалося зразумець з апісання на англійскай мове, проста жудасныя...

Абавязковы пункт у Ісфахане — мінарэты Manar Jomban. Не самыя прыгожыя, але адназначна загадкавыя. Кожную гадзіну, калі ў адзін з мінарэтаў узнімаецца служка і пачынае званіць у звон, другі мінарэт «падтанцоўвае» ў такт першаму. Бачна няўзброеным вокам...

Увогуле Ісфахан — той горад, у якім можна свабодна рухацца ў любым кірунку: усё адно знойдзеш нешта цікавае. Дарэчы, любавацца горадам можна абсалютна самастойна як днём, так і ўвечары без апасенняў за сваё здароўе ці жыццё: злачыннасць у краіне вельмі нізкая. Можа таму, што ў некаторых месцах ёсць нават спецыяльная турыстычная паліцыя.

Яшчэ адзін горад, што нам пашчасціла наведаць, — Хамадан. Менавіта тут знаходзіцца маўзалей вялікага лекара і філосафа Авіцэны. Колькасць калон — па колькасці галінаў ведаў, якія ён у дасканаласці спасцігнуў. Дарэчы, згодна з распаўсюджанай версіяй, тэрмін «медыцына» ўтварыўся ад лацінізаванага «медад Сіна». Персідскае ж імя лекара гучыць так: Абу Алі Хусейн Ібн Абдаллах Ібн Сіна. Памёр Авіцэна ва ўзросце 57 гадоў у выніку цяжкай хваробы. Людзі адмаўляліся верыць у тое, што геніяльны ўрач, які многіх выцягнуў ледзь не з таго свету, не змог перамагчы ўласную хваробу. Натуральна, узнікла легенда, згодна з якой Ібн Сіна прыгатаваў 40 лекаў, што павінны былі яго ўваскрэсіць, і аддаў вучню. Калі той прыступіў да лячэння, то заўважыў неверагодныя пераўтварэнні з целам настаўніка: яно станавілася ўсё больш маладым, здавалася, Авіцэна вось-вось падымецца... Гэта моцна ўзрушыла вучня, і ён не ўтрымаў у руках апошні саракавы сасуд...

У Хамадане знаходзіцца яшчэ адно знакамітае пахаванне — магіла Эстэр (Эсфіры) і Мардэхая. Прыгажуні Эсфіры, як вядома, прысвечана цэлая кніга Ветхага запавета пад аднайменнай назвай. З Бібліяй звязана і яшчэ адно мясцовае павер'е. Справа ў тым, што Хамадан размешчаны каля падножжа гары Альванд. Лічыцца, што менавіта на зялёных гарах, якія апаясваюць горад, пасля доўгага плавання высадзіліся абітальнікі Ноевага каўчэга.

Галоўная адметнасць горада — Гяньджнамэ — даволі цікавы помнік, які захаваўся з часоў Ахменідаў. Ён уяўляе сабой каменную пліту з выбітымі на ёй надпісамі. Побач — найпрыгажэйшы вадаспад. Надпіс выкананы клінапісам, які доўгія вякі заставаўся забытым і не расшыфраваным. Прачытаць яго ўдалося толькі ў XIX стагоддзі. Аказалася, што размова ў тэксце ідзе зусім не пра скарбы, як лічылася, а пра вялікага персідскага цара Дарыя. Маўляў, «Вялікі бог Акурамазда, які стварыў зямлю і неба, зрабіў мяне царом над царамі...». І гэтак далей.

Яшчэ адно месца, дзе абавязкова варта пабываць, — пячора Алі Садр непадалёк ад Хамадана. Сапраўдны восьмы цуд свету! Пячора расцягваецца на 60 кіламетраў, змяшчае некалькі вялізных азёр і ў вышыню (дакладней было б сказаць, у глыбіню) дасягае 40 метраў! Дарэчы, па гэтых азёрах і рэках пракладзены турыстычны маршрут на лодках і катамаранах. Рух — як на праспекце.

...Памятаеце пытанні для самаправеркі ведаў пра Іран з першай часткі артыкула? Надышоў час развеяць яшчэ адзін міф. Фотаздымак шлюбнага ложка шаха ў адным з палацаў і тэкстоўка пра яго 700 жонак многіх увялі ў зман. Справа ў тым, што іслам сапраўды дазваляе мець некалькі жонак, аднак з пункту гледжання іранскай маралі гэта страшэннае парушэнне грамадскіх традыцый. Да «мнагажонцаў» тут ставяцца насцярожана. У вялікіх гарадах такіх амаль няма. Як мяне запэўнілі самі іранцы, мужчын, якія маюць дзвюх жонак, не больш... за сотню. Каб пералічыць тых, хто мае трох, хопіць пальцаў на руках... У аддаленых вёсках такіх «мініі-шахаў» больш, аднак і там яны звычайна асабліва павагай не карыстаюцца. Хоць, вядома, бываюць і выключэнні. Напрыклад, калі мужчына ажаніўся ў другі раз з-за цяжкай хваробы першай жонкі, з якой не развёўся і пра якую працягвае клапаціцца.

**Сяргей ПРОТАС.**

***(Заканчэнне будзе).***



Другая ў свеце па памерах плошча ўражвае сваёй веліччу.
Калодзеж з роднымі матывамі ў адным з двароў Ісфахана.
У садзе птушак можна сустрэць любую экзотыку.
Лаваш з кунжутам — самы смачны.

Літаральна на калене робяцца сапраўдныя шэдэўры.
Гэты хлопец засвоіў азы майстэрства роспісу фарфору менш як за год.
Іранскі варыянт папкорну выпякаецца проста на газавай гарэлцы.

«Караваны» лодак і катамаранаў на азёрах пячоры Алі Садр.

Маленькія тэгеранцы вельмі ўзрадаваліся падарункам з незнаёмымі літарамі і захацелі прыехаць у Беларусь.

# ГРАМАДСКАЯ ДУМКА АБ САЦЫЯЛЬНА-ПАЛІТЫЧНАЙ СІТУАЦЫІ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

*(першае паўгоддзе 2010 г.)*

## Сацыяльнае самаадчуванне насельніцтва

Паводле вынікаў даследавання, самаідэнтыфікацыя рэспандэнтаў па ўзроўні жыцця на працягу апошніх двух з паловай гадоў застаецца ранейшай. Пераважная большасць грамадзян (78 %) прылічылі сябе да людзей «з сярэднім дастаткам», гл. дыяграму 1.

**Дыяграма 1.**

**Кім Вы сябе лічыце па ўзроўні жыцця?**
*(у % ад колькасці апытаных)*




За апошні год **узрасла колькасць грамадзян, задаволеных сваім жыццём,** з 68 да 77,5 % *(гл. дыяграму 2)*.

**Дыяграма 2.**

**У якой меры Вас задавальняе цяпер Ваша жыццё?**
*(у % ад колькасці апытаных)*

На пытанне **«Ці ўпэўненыя Вы ў заўтрашнім дні?»** 67,5 % грамадзян адказалі **сцвярджальна**. За год колькасць грамадзян, упэўненых «у заўтрашнім дні», павялічылася на 13 % *(гл. дыяграму 3)*.

**Дыяграма 3.**

**Ці ўпэўненыя Вы ў заўтрашнім дні?**
*(у % ад колькасці апытаных)*




## Праблемы, якія выклікаюць у грамадзян найбольшае хваляванне

Для большасці насельніцтва, як і год таму, найбольш хвалюючымі праблемамі з'яўляюцца: алкагалізм сярод насельніцтва (42,5 %), жыллёвае пытанне (28 %), беспрацоўе (25 %), узровень злачыннасці і выхаванне моладзі (па 21 %), наркаманія і нізкі ўзровень культуры насельніцтва (па 20 %).

Практычна на адным узроўні трывожнасці (у сярэднім 13 %) грамадзянамі ўспрымаліся: сітуацыя ў сферы аховы здароўя, карупцыя, экалагічныя праблемы (гл. дыяграму 4).

**Дыяграма 4.**

**Якія з пералічаных праблем выклікаюць у Вас найбольшае хваляванне?**
*(у % ад колькасці апытаных)*




1. Алкагалізм
2. Жыллёвая праблема
3. Беспрацоўе
4. Злачыннасць
5. Выхаванне моладзі
6. Наркаманія
7. Нізкі ўзровень культуры насельніцтва
8. Сітуацыя ў сферы аховы здароўя
9. Карупцыя
10. Недастатковая сацыяльная абарона грамадзян
11. Экалагічныя праблемы (аховы навакольнага асяроддзя)
12. Фінансава-эканамічнае становішча прамысловых прадпрыемстваў
13. Неэфектыўнасць дзяржаўнага кіравання
14. Дэмаграфічная сітуацыя (нараджальнасць, смяротнасць)
15. Сітуацыя ў сферы адукацыі
16. Пагроза тэрарыстычных актаў
17. Фінансава-эканамічнае становішча сельскагаспадарчых арганізацый
18. Сітуацыя ў сферы жыллёва-камунальнай гаспадаркі (ЖКГ)
19. Энергетычная бяспека
20. Палітычныя супярэчнасці ўнутры краіны
21. Міжнацыянальная напружанасць
22. Напружанасць на рэлігійнай глебе

За апошні год паменшылася колькасць рэспандэнтаў, якія ўказалі на жыллёвую праблему (з 33 да 28 %) і беспрацоўе (з 37,5 да 25 %).

## У ЦЭНТРЫ МІНСКА АДКРЫЛАСЯ НОВАЯ АЎТАСТАЯНКА

на вуліцы Гікала, 1А. Яна разлічаная на 206 машына-месцаў. Аўтастаянка забяспечаная аўтаматычнай сістэмай уліку транспартных сродкаў. Сутачны кошт захоўвання легкавых аўтамабіляў і мікрааўтобусаў 5330 рублёў, у месяц гэта паслуга абыдзецца кліенту ў 80 тысяч рублёў.

У бліжэйшай будучыні ў Мінску плануецца адкрыць падобныя аб'екты ў Ленінскім раёне на вуліцах Шпілеўскага і Прушынскіх, а таксама ў Заводскім раёне на вуліцы Галадзеда.

**Ігар ГОЛАД, «Мінск—Навіны».**

**Швабский сельский исполнительный комитет Логойского района Минской области**

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

**по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов**

| № п/п | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь, га | Расходы по подготовке документ. | Начальная цена (рублей) | Задаток (рублей) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Морозовка, участок № 2 623287605601000007 | 0,25 | 1 349 025 | 2 500 000 | 250 000 |
| 2 | д. Морозовка, участок № 3 623287605601000016 | 0,25 | 1 349 025 | 2 500 000 | 250 000 |
| 3 | д. Морозовка, участок № 4 623287605601000019 | 0,2196 | 1 349 025 | 2 196 000 | 219 600 |
| 4 | д. Морозовка, участок № 9 623287605601000008 | 0,25 | 1 349 025 | 2 500 000 | 250 000 |
| 5 | д. Морозовка, участок № 10 623287605601000013 | 0,25 | 1 349 025 | 2 500 000 | 250 000 |
| 6 | д. Морозовка, участок № 11 623287605601000012 | 0,25 | 1 349 025 | 2 500 000 | 250 000 |
| 7 | д. Морозовка, участок № 13 623287605601000017 | 0,25 | 1 349 025 | 2 500 000 | 250 000 |
| 8 | д. Морозовка, участок № 14 623287605601000020 | 0,25 | 1 349 025 | 2 500 000 | 250 000 |
| 9 | д. Морозовка, участок № 15 623287605601000010 | 0,25 | 1 349 025 | 2 500 000 | 250 000 |
| 10 | д. Морозовка, участок № 16 623287605601000011 | 0,25 | 1 349 025 | 2 500 000 | 250 000 |
| 11 | д. Морозовка, участок № 17 623287605601000021 | 0,2084 | 1 349 025 | 2 084 000 | 208 400 |

Задаток перечисляется на р/с № 3600619161107, ЦБУ № 611 филиала № 500, Минское управление ОАО «АСБ Беларусбанк», код 601 г. Логойска. УНП 600181592, Швабский сельский исполнительный комитет. Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок, возместит расходы, связанные с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона. Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с документацией и земельными участками. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **4 октября 2010 г.** в 09.00 по адресу: д. Швабы, ул. Парковая, д. 26 Логойского района Минской обл. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 28 сентября 2010 г.**

**Контактные телефоны: (8 01774) 59 1 35, 59 2 35, (+375 29) 107 16 17.**
**Наш сайт в интернете: logoysk.gov.by.**

## Усміхнемся!

**Дыялогі ў сеціве.**

**— Дык я мілая? ) А яшчэ якая?**
**— Прыгожая.**
**— А яшчэ? )**
**— Абаяльная.**
**— Яшчэ? )**
**— Ты карыстаешся тым, што я нецвярозы? ))**
**— Давай далей, не адцягвай увагу )**

☺

З жыцця падлеткаў.

Любіш сэксам займацца, любі і «Змярканне» глядзець.

☺

**— Вось адразу адчуваецца розніца ва ўзросце паміж жаніхом і нявестай. У жаніха дзіцячыя фоткі ўсё чорна-белыя, а ў нявесты — лічбавыя...**

☺

У бальніцу са шматлікімі агнястрэльнымі раненнямі паступіў вядомы крымінальны аўтарытэт. Цяпер лекары змагаюцца за сваё жыццё.

☺

**— Нарадзілася цяпер у мяне адна думка!**
**— Падзяліся.**
**— Апошнім не дзеляцца.**

☺

Пенсіянер з Іркуцка, калі даведаўся, што Пэрыс Хілтан пазбавілі спадчыны, адпісаў ёй свае шэсць сотак.

Прамая лінія

# ДЫЯГНАЗ РАК: НЕ ЗДАВАЦЦА, ЗМАГАЦЦА

**НАША чарговая «прамая лінія» прысвечана анкалагічным праблемам. Чытачоў кансультаваў галоўны ўрач Мінскага гарадскога клінічнага анкадыспансэра, дацэнт, кандыдат медыцынскіх навук Зігмунд ГЕДРЭВІЧ.**

***(Заканчэнне. Пачатак у нумарах за 1 і 2 верасня.)***

***☎— Турбуе Андрэй Васільевіч з Мінска. Мне прапанавалі зрабіць біяпсію гартані, а адсюль і пытанні: наколькі балючая гэта працэдура, ці давядзецца класціся ў стацыянар і ці могуць тут быць якія-небудзь ускладненні?***

— Працэдура біяпсіі гартані, магчыма, і крыху непрыемная, але праходзіць яна без болю — спецыяльнымі шчыпцамі проста возьмуць невялікі, літаральна ў некалькі міліметраў, кавалачак тканкі.

Як правіла, біяпсію гартані робяць амбулаторна. Прычым якіх-небудзь ускладненняў тут звычайна няма.

***☎— Людміла Аляксандраўна, г. Мінск. Чатыры гады таму перанесла анказахворванне, зрабілі аперацыю. Чаму пасля гэтага мяне не накіравалі на рэабілітацыю ў санаторый у Гарадзішча?***

— Санаторый у Гарадзішчы стаў працаваць па рэабілітацыі анкалагічных хворых зусім нядаўна, — інакш кажучы, чатыры гады. Таму даць вам туды пуцёўку проста не маглі. Калі ж вы маеце жаданне наведаць санаторый зараз, то вырашаць гэта пытанне неабходна ў сваёй паліклініцы — праз анкаўролага ці рэабілітолага. Паказанні да аздараўлення могуць вызначыць толькі яны.

***☎— Тэлефаную з Віцебшчыны. Доктар, у нас бяда: у майго таты знайшлі пласкаклетачны рак горла. Гэта сапраўды прыгавор?***

— Дазвольце запытацца: вы звярталіся да анколагаў?

***— Так. Мы ездзілі на кансультацыю ў Мінск, а цяпер тата лечыцца ў абласной бальніцы — праходзіць курс хіміятрамянёвай тэрапіі. Вось і ўсё.***

— Не варта адносіцца да хіміятрамянёвай тэрапіі скептычна — гэта адзін з метадаў лячэння. І гэты метад дастаткова эфектыўны — частка пацыентаў вылечваецца цалкам. Што ж да іншых мер, скажам, хірургічнага лячэння, то наконт гэтага павінны вызначыцца дактары на месцы. Прычым сумнявацца ў эфектыўнасці медыцынскай дапамогі ў рэгіёнах таксама нельга. Варта адзначыць, што ў Беларусі існуюць пратаколы лячэння анкалагічных хворых. Адпаведна, такія хворыя лечацца па адной схеме паўсюль — і ў Мінску, і ў Віцебску.

Дарэчы, яшчэ адна заўвага. Анкалагічныя захворванні ўзнікаюць не адразу і не ў адзін дзень — яны развіваюцца гадамі. І вылечванне перш-наперш залежыць ад таго, наколькі рана была выяўлена праблема.

***— Аднак як доўга будзе праводзіцца хіміятэрапія?***

— Адназначна сказаць цяжка: іншым разам можа спатрэбіцца 5-6 курсаў хіміятэрапеўтычнага лячэння. Прычым зразумела: рак — захворванне вельмі сур'ёзнае. Аднак многія пацыенты выздараўліваюць і жывуць дастаткова доўга. І асабліва — калі гаворка ідзе аб раку 1 і 2 ступеняў.

***— Тады апошняе: тату прызначылі паласканне горла звычайным сланечнікавым алеем. Гэта правільна?***

— Сланечнікавы алей забяспечвае патрэбны ўвільгатняльны эфект і здымае балявы сіндром, таму нічога дзіўнага тут няма. Зрэшты, калі урач бацькі палічыць патрэбным, то можна выкарыстоўваць аліўкавы ці абляпіхавы алей.

***☎— Наталля Іванаўна, г. Мінск. У мужа знайшлі хранічны мієлалейкоз, аднак прагрэсіі пакуль няма. Ці зможам мы мець дзяцей?***

— Адказ на пытанне наконт дзяцей шмат у чым залежыць ад вашага ўзросту і стану рэпрадуктыўнай сістэмы. Што ж да ўплыву мієлалейкозу, то тут лепш за ўсё параіцца з урачом, які праводзіў лячэнне. Прынамсі, звычайна мы не рэкамендуем заводзіць дзяцей на працягу трох гадоў пасля лячэння хіміяпрэпаратамі. Бо тры гады — найбольш адэкватны перыяд назірання, пасля якога можна казаць, што рэцыдыву хваробы няма.

***☎— Завуць мяне Алена, тэлефаную з Мінска. Праведзена 4 сеансы хіміятэрапіі (ifосфамід і доксарубіцын): ці змагу я пасля гэтага мець дзяцей?***

— Зноў жа гэта пытанне — найперш да ўрача, які вас лечыць.

***☎— Вераніка Паўлаўна, г. Мінск. Прайшлі 6 курсаў хіміятэрапіі, потым прызначаны тэмадал. Пасля гэтага стан майго бацькі рэзка пагоршыўся: пастаянна баліць галава, раздражнёнасць на гук і святло, кепска арыентуецца ў часе і прасторы, амаль увесь час спіць. Выпісалі дэксаметазон — уколы 2 разы ў дзень. Аднак, магчыма, ёсць нейкія іншыя і больш эфектыўныя сродкі? І ці варта ў такой сітуацыі працягваць прыём тэмадалу?***

— Калі прычына галаўнога болю ўдакладнена, магчыма, вам мэтазгодна звярнуцца ў хоспіс — каб адтуль пад'ехаў доктар і прызначыў больш эфектыўны сродак. Дарэчы, хоспіс у сталіцы знаходзіцца па адрасе: вул. Стаханаўская, 19.

***☎— Таццяна Пятроўна з Мінска. Ці можна прайсці ў Мінскім гарадскім анкадыспансэры платнае абследаванне шчытападобнай залозы?***

— Так. Прычым каштаваць ультрагукавое даследаванне будзе 8750, а кансультацыя анколага І катэгорыі — 10.980 рублёў.

**«Прамую лінію» правялі Вольга ШАЎКО і Сяргей ГРЫБ.**

**УЗДЕНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ**

**8 октября 2010 года** в 10.00 в зале заседаний исполкома (4-й этаж), расположенного по адресу: г. Узда, ул. Советская, 22, проводит открытый аукцион на право заключения договоров аренды земельных участков,

**в 11.00 – открытый аукцион по продаже в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов,**
**в 12.00 – аукцион по продаже земельного участка общей площадью 0,2052 га для ведения подсобного хозяйства в д. Зеньковичи Узденского района**
(начальная цена продажи земельного участка 278 550 рублей).

**На аукционные торги на право заключения договоров аренды выставляются следующие участки с начальной ценой:**

| № лота | Продавец | Местонахождение участка | S (га) | Кадастровый номер | Начальная цена (бел. руб.) | Расходы по формированию зем. уч. (кроме расходов на публикацию извещения) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Лот № 1 | Узденский райисполком | Земельный участок № 3: г. Узда, ул. Новицкого | 0,1389 | 625650100001000514 | 9 913 320 | 1 871 844 |
| Лот № 2 | Узденский райисполком | Земельный участок № 4: г. Узда, ул. Новицкого | 0,1562 | 625650100001000532 | 7 148 060 | 1 386 462 |
| Лот № 3 | Узденский райисполком | Земельный участок: г. Узда, ул. Колхозная | 0,0150 | 625650100005000430 | 372 800 | 1 635 337 |

Целевое назначение участков: Участки по ул. Новицкого предназначены для строительства и обслуживания здания магазина, по ул. Колхозной – для установки и обслуживания торгового павильона. Участки свободны от строений. Инженерные коммуникации: имеется возможность подведения к газоснабжению, водоснабжению, водоотведению. Срок аренды земельных участков – 25 лет.

На аукционные торги по продаже в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов выставляются следующие участки с начальной ценой:

| № лота | Продавец | Местонахождение участка | S (га) | Кадастровый номер | Начальная цена (бел. руб.) | Расходы по формированию зем. уч. (кроме расходов на публикацию извещения) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Лот № 1 | Дещенский с/Совет | Земельный участок: д. Городище, ул. Центральная, 18А | 0,1500 | 625682502601000019 | 4 000 000 | 705 692 |
| Лот № 2 | Дещенский с/Совет | Земельный участок: д. Рябиновка, ул. Рябиновая. Участок № 37 | 0,1501 | 625682509601000044 | 2 000 000 | 726 714 |
| Лот № 3 | Дещенский с/Совет | Земельный участок: д. Рябиновка, ул. Рябиновая. Участок № 39 | 0,1501 | 625682509601000045 | 2 000 000 | 742 258 |

К участку, расположенному по адресу: д. Городище Озерского сельского Совета имеется возможность подключения к газоснабжению и водоснабжению, в д. Рябиновка отсутствуют все инженерные коммуникации.

Задаток в размере 10 процентов от начальной цены земельного участка перечисляется путем безналичных расчетов платежным поручением (квитанцией) на счет 3602631002502 финансового отдела Узденского райисполкома в филиале 606 ОАО «Беларусбанк» г. Дзержинска, МФО 153001514, УНП 600203994, код платежа на право заключения договоров аренды 04002, код платежа по продаже земельных участков в частную собственность 04901. Граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задаток в размере, установленном для предмета аукциона с наибольшей начальной ценой.

**Заявления на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: г. Узда, ул. Советская, 22, второй этаж, кабинет 206 с 8.00 до 17.00 по рабочим дням с 8 сентября по 4 октября 2010 года.**

Заключительная регистрация – с 8.30 до 10.55 в день проведения аукциона.

**Участники аукциона должны представить следующие документы:**

• заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков;

• заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц представляют документ, удостоверяющий личность.

Аукцион состоится по каждому лоту при наличии не менее двух участников.

Оплата победителем за предмет аукциона производится разовым платежом путем безналичных расчетов.

Победителю за предмет аукциона необходимо произвести возмещение фактических расходов по организации и проведению аукциона и подготовке документации для его проведения.

Победителю аукциона на право заключения договоров аренды предлагаемых участков до осуществления государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права аренды на него необходимо возместить в установленном порядке потери сельскохозяйственного производства по лоту № 1 – 7 598 990 рублей, лоту № 2 – 8 545 450 рублей. Потери перечисляются на счет республиканского бюджета № 3602916242508, открытый Главному управлению Министерства финансов Республики Беларусь по Минской области в ЦБУ № 625 г. Узды, ф-л № 606 ОАО «Беларусбанк» г. Дзержинска, МФО 153001514, УНП 600003447, код платежа 05201.

Участники аукциона предварительно могут ознакомиться с земельными участками, которые предлагаются для продажи на аукционе путем выезда к месту нахождения этих участков.

**Более подробная информация об аукционах, условиях участия по телефонам: (801718) 55404, 54705, 55338.**

**г. ВИТЕБСК** **06.10.2010**

**ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ**

**ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ ГОСУДАРСТВЕННОЙ СОБСТВЕННОСТИ С ОДНОВРЕМЕННОЙ ПРОДАЖЕЙ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ**

| № лота | Наименование предмета аукциона | Характеристика предмета аукциона | Начальная цена продажи предмета аукциона, рублей | Сумма задатка, рублей |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение, расположенное по адресу: г. Витебск, Смоленская площадь, 12, и право заключения договора аренды земельного участка. | Характеристика объекта недвижимости: памятник архитектуры конца XIX начала XX вв., расположен в границах охранной зоны исторического р-на, здание двухэтажное кирпичное, общая площадь 480 кв.м, фундамент бутовый ленточный, перекрытия железобетонные, крыша шиферная и металлическая.<br>Земельный участок: с кадастровым номером 240100000001000670, площадь 0,1323 га для обслуживания здания сроком аренды 50 лет. Ограничения в использовании земель в связи с нахождением в санитарно-защитных полосах водопроводов площадью 0,0014 га.<br>**Назначение и использование участка** – размещение кафе, гостиницы, выставочного зала, бытовых услуг, административных помещений. | **781 891 214** | **78 189 120** |
| 2. | Здание магазина, расположенное по адресу: Витебская обл., Городокский р-н, г. Городок, ул. Вокзальная, 40а, и право заключения договора аренды земельного участка. | Начальная цена объекта недвижимости снижена на 50 %<br>Характеристика объекта недвижимости:<br>капитальное строение с инвентарным номером 201/С-11334 – здание специализированное розничной торговли (магазин) – одноэтажное кирпичное здание 1974 г. постройки общей площадью 457,2 кв.м, фундамент бетонный, перекрытия – ж/б плиты; крыша рулонная, с кирпичным тамбуром, двумя кирпичными сходами в подвал, железобетонным подвалом и асфальтобетонным покрытием.<br>Земельный участок: площадью 0,0625 га, сроком аренды 99 лет, кадастровый номер 221850100001003220, для размещения объектов розничной торговли. Ограничение в использовании всего участка в связи с нахождением в водоохранной зоне реки, а также охранная зона линии электропередач напряжением до 1000 В на площади 0,0026 га. | **45 292 537** | **4 529 250** |
| 3. | Здание фельдшерско-акушерского пункта, расположенное по адресу: Витебская обл. Городокский р-н, г. Городок, ул. Вокзальная, д. 53, и право заключения договора аренды земельного участка. | Начальная цена объекта недвижимости снижена на 50 %<br>Характеристика объекта недвижимости:<br>капитальное строение с инвентарным номером 201/С-11373 – здание специализированное здравоохранения и предоставления социальных услуг (здание фельдшерско-акушерского пункта) – одноэтажное бревенчатое здание 1949 г. постройки общей площадью 105,4 кв.м, фундамент бутобетонный, перекрытия деревянные, крыша шиферная, с двумя холодными кирпичными пристройками, дощатым сараем, забором деревянным, двумя калитками, уборной.<br>Земельный участок: площадью 0,1126 га, кадастровый номер 221850100001003221, срок аренды участка – 99 лет, для размещения объектов здравоохранения и предоставления социальных услуг. Охранная зона линии электропередач напряжением до 1000 В на площади 0,0204 га. | **25 073 008** | **2 507 300** |
| 4. | Здание трансформаторной подстанции, расположенное по адресу: г. Витебск, ул. Карла Маркса, в районе дома № 32, и право заключения договора аренды земельного участка | Начальная цена объекта недвижимости снижена на 20 %<br>Характеристика капитального строения:<br>капитальное строение с инв. № 200/С-57715 – здание специализированное энергетики, трансформаторная подстанция № 4-с общей площадью 66,0 кв.м, одноэтажное кирпичное, фундамент бетонный, перекрытие железобетонное, крыша рулонная.<br>Земельный участок с кадастровым номером 240100000002003011 площадью 0,0122 га, для содержания и обслуживания трансформаторной подстанции сроком аренды 99 лет. Ограничения в использовании в связи с нахождением участка в охранной зоне магистральных трубопроводов, систем газоснабжения и других линейных сооружений (ливневая канализация), водопровода, охранных зонах линии электропередач напряжением свыше 1000 В, теплотрассы. | **20 253 155** | **2 025 310** |
| 5. | Здание склада грузового прирельсового с рампой, расположенное по адресу: Витебская обл., Браславский р-н, Друевский с/с, п. Друя, и право заключения договора аренды земельного | Начальная цена объекта недвижимости снижена на 50 %<br>Характеристика объекта недвижимости:<br>капитальное строение с инвентарным номером 210/С-11360 – (здание нежилое), одноэтажное кирпичное, перегородки – кирпичные, крыша – а/волнистая, общая площадь 385,6 кв.м, бетонные крыльца, бытовое помещение – общая площадь 46 кв.м.<br>Земельный участок: с кадастровым номером 220882710005000001 для размещения объектов железнодорожного транспорта – для обслуживания склада грузового прирельсового с рампой, площадь 0,1276 га, срок аренды 40 лет. Использование – для обслуживания здания склада. | **49 458 964** | **4 945 890** |

**ОРГАНИЗАТОР – фонд «Витебскоблимущество», г. Витебск, ул. «Правды», 38, контактный телефон-факс в Витебске: (0212) 476096, сайты www.gki.gov.by, www.fondgosim.vitebsk.by, e-mail:votfondgi@tut.by.**

ПРОДАВЕЦ: по Лоту № 1 – Учреждение образования «Витебский государственный университет имени П.М. Машерова», тел. (0212) 21 98 24;

по Лотам №№ 2–5 – Транспортное республиканское унитарное предприятие «Витебское отделение Белорусской железной дороги», телефон в Витебске: (0212) 378887.

**Условия продажи объекта недвижимости по Лоту № 1:**

В соответствии со статьей 53 Закона Республики Беларусь «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь» не позднее одного месяца со дня заключения договора купли-продажи капитального строения подписать и зарегистрировать в Министерстве культуры охранное обязательство.

**Условия пользования земельным участком:**

**по лоту № 1** – заключение победителем аукциона с Витебским городским исполнительным комитетом договора аренды земельного участка и осуществление в двухмесячный срок со дня получения решения (выписки из решения) Витебского городского исполнительного комитета о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права аренды на земельный участок;

- осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией;

**по лотам №№ 2, 3, 5** – заключение победителем аукциона с райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществление в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок;

- получение победителями аукционов в установленном порядке разрешения райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на реконструкцию объектов в срок, не превышающий два года;

**по лоту № 4** – в случае изменения целевого назначения помещения (здания) получить в отделе архитектуры и строительства Витебского городского исполнительного комитета разрешительные документы на проектирование;

- заключение победителем аукциона с Витебским городским исполнительным комитетом договора аренды земельного участка и осуществления в двухмесячный срок после принятия решения Витебского городского исполнительного комитета о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок;

- осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

**1. Аукцион состоится 6 октября 2010 г. в 15 часов в здании фонда «Витебскоблимущество» по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38.**

Для участия в аукционе приглашаются граждане, юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы. Участнику необходимо подать заявление и подписать Соглашение установленной формы с фондом "Витебскоблимущество".

**Лица, желающие принять участие в аукционе, к заявлению прилагают:** заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также представляются: юридическими лицами Республики Беларусь – доверенность, выданная представителю юридического лица, копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования; индивидуальными предпринимателями – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранными юридическими лицами – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с нотариально удостоверенным переводом на белорусский (русский) язык; представителем индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00, **последний день приема документов 5 октября 2010 до 17.00** по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38, кабинет 308. **Заключительная регистрация участников 6 октября 2010 с 14.00 до 15.00**. К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

2. Сумма задатка перечисляется до подачи заявления на участие в аукционе на расчетный счет № 3642903000021, в филиале ОАО «БПС-Банк» по Витебской области г. Витебск, код 150801307. Получатель – фонд «Витебскоблимущество», УНП 300002495.

3. Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену.

4. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты его проведения.

**5. Участник, ставший победителем аукциона (претендентом на покупку), после окончания аукциона обязан:** подписать протокол аукциона; **не позднее 10 рабочих дней** со дня принятия решения горрайисполкома о предоставлении земельного участка внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, в сумме 2 миллионов рублей (по каждому лоту), расходы, связанные с формированием земельных участков и изменением земельных участков в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого участка; **не позднее 12 рабочих дней** со дня принятия решения о предоставлении земельного участка заключить договор купли-продажи недвижимости и договор аренды земельного участка.

6. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектами продажи.

# СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.

## 3 верасня

**1927 год** — нарадзіўся (в. Канюхі Капыльскага раёна) Алесь Адамовіч, беларускі пісьменнік, крытык, літаратуразнаўца. Член-карэспандэнт АН Беларусі (1980), доктар філалагічных навук, прафесар. З 1954 года працаваў у Інстытуце літаратуры АН Беларусі, з 1987 — дырэктар НДІ кінамастацтва (Масква). Аўтар дылогіі «Партызаны», «Хатынскай апавесці», адзін з аўтараў кнігі «Я з вогненнай вёскі...» і інш. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Я. Коласа (1976). За мастацкі фільм «Ідзі і глядзі» па сцэнарыі А. Адамовіча і Э. Клімава, у аснове якога «Хатынская аповесць» і «Карнікі: Радасць нажа, ці Жыццяпіс гіпербарэю» — першае месца і Залаты медаль на Міжнародным кінафестывалі ў Маскве (1985). Памёр у 1994 годзе.

**1783 год** — Парыжскім мірным дагаворам завяршылася Вайна за незалежнасць Амерыкі. Брытанія прызнала суверэнітэт ЗША.

*«Толькі адукаваны чалавек хоча вучыцца, невук жадае вучыць».*

**Эдуард Ле Бурк'е.**

# ЧЫРВОНЫ КОЛЕР

**Найбольш значныя этапы ў жыцці чалавека (нараджэнне — вяселле — смерць) суправаджаюцца складанымі і працяглымі па часе рытуальна-абрадавымі комплексамі, структура якіх мае амбівалентны (адначасова звернуты ў мінулае і ў будучыню) характар. З аднаго боку, яны канстатуюць факт «смерці» чалавека ў яго папярэднім сацыяльным статусе, а з другога — выкананне пэўнага рытуалу дазваляе яго ўдзельніку выйсці з пераходнай зоны (зоны смерці-перараджэння) і атрымаць прынцыпова іншы грамадскі статус.**

**Прывядзём толькі некаторыя прыклады ўзаемаспалучэння або рытуальнага супрацьпастаўлення атрыбутаў чырвонага колеру з атрыбутамі белага колеру.**

● Каб не дапусціць да парадзіхі злых духаў, а таксама каб папярэдзіць родавыя пашкоджанні, праз яе пракідвалі чырвоную нітку (пояс), якая выконвала ролю магічна-ахоўнага сродку.

● Пасля першага рытуальнага купання дзіця туга спавівалі ў белае, а затым перавязвалі чырвоным паскам (адмысловым саматканым поясам, які перадаваўся ад пакалення да пакалення і зноў-такі выконваў ролю паяднання сям'і і найперш — дзетак).

● Адным з галоўных атрыбутаў беларускага вясельнага абраду быў каравай, які сімвалізаваў жыццесцвярджальнае радавое адзінства, пачатак новага жыццёвага цыкла ў бясконцым радаводным ланцужку. Вясельныя песні, што гучалі падчас прыгатавання каравая і асабліва ў той момант, калі яго даставалі з печы, засяроджвалі ўвагу на ідэалізаванай характарыстыцы жанчын-каравайніц; далей у адпаведнасці з прынцыпам псіхалагічнага паралелізму гэтыя ж якасці пераносіліся на каравай, які быццам бы мадэляваў і праграмаваў шкалу каштоўнасцяў і духоўную арыентацыю мікракосмасу будучай сям'і. Часцей за ўсё асноўным колерам, які характарызаваў сэнсава-змястоўны аспект каравая, быў чырвоны.

● На Палессі захавалася старажытная форма ўпрыгожвання каравая «шышачкамі» (сімвалам эратычнага пачатку і адначасова элементам вянчання мадэлі сусвету), а зверху яшчэ і чырвонымі стужкамі. У Беларусі найбольш распаўсюджаным быў трохузроўневы каравай, ніжняя, самая шырокая частка якога сімвалізавала род, сярэдняя (меншая) — сям'ю. Завяршалася кампазіцыя каравая парай «галубкоў» (сімвал маладых), павернутых адзін да аднаго, дзюбачкай да дзюбачкі. Гэтыя птушачкі таксама перавязваліся чырвонымі стужкамі (васьмёркай — знакам вечнасці, бясконцасці).

● Калі пачыналі дзяліць каравай і адорваць маладых адзеннем, палатном, бялізнай, грашамі і жывёлай, у некаторых мясцовасцях першай да маладых падыходзіла маці і дарыла чырвоны андарак.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.21 | 19.56 | 13.35 |
| Віцебск — | 6.08 | 19.48 | 13.40 |
| Магілёў — | 6.11 | 19.46 | 13.35 |
| Гомель — | 6.10 | 19.40 | 13.30 |
| Гродна — | 6.36 | 20.10 | 13.34 |
| Брэст — | 6.39 | 20.08 | 13.29 |

### Месяц

***Апошняя квадра 1 верасня. Месяц у сузор'і Рака.***

### Імяніны

***Пр.*** *Васы, Абрама, Агапія, Аляксандра, Паўла, Фадзея.*

***К.*** *Ізабелы, Рыгора, Шымана, Яўхіма.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## НАДВОР'Е на заўтра




**СЛУХАЙЦЕ АГЛЯДЫ МАТЭРЫЯЛАЎ ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА»:**

Радыё РМ 92,4 FM Минск — на Радыё-Мінск з аўторка па пятніцу ў ранішняй праграме **«КАВА ПА-ВЕНСКУ»** (Мінск – 92.4 FM, Віцебск – 106.4 FM, Магілёў – 98.1 FM, Гомель – 105.6 FM)

Радыё РОКС — на Радыё-Рокс з аўторка па пятніцу **РАНІЦАЙ У 7.40, УВЕЧАРЫ Ў 22.30** (Мінск – 102.1 FM, Віцебск – 103.0 FM, Гродна – 106.9 FM, Брэст – 101.2 FM, Гомель – 102.6 FM, Магілёў – 103.4 FM)

Беларускае радыё. Канал культуры — на Радыё-Культура з аўторка па пятніцу ў ранішняй праграме **«У РЫТМЕ ДНЯ»** (Мінск – 102.9 FM, Віцебск – 99.3 FM, Гродна – 95.0 FM, Брэст – 88.5 FM, Магілёў – 99.1 FM, Гомель – 91.53 FM)

## Беларусь і свет

### Беларусь прываблівае іншаземцаў

Са студзеня па ліпень 2010 года ў краіну прыбылі на пастаяннае жыхарства 8 тысяч чалавек, а выехала з краіны 3 тысячы, паведамілі ў Міністэрстве ўнутраных спраў. Усяго за 7 месяцаў гэтага года від на жыхарства атрымалі 7,5 тысячы чалавек, часовую рэгістрацыю — 13 тысяч. Акрамя таго, у краіне зарэгістравана 84 тысячы іншаземцаў.

**Марта МАРКАЧЭЎСКАЯ.**

**СА «ЗВЯЗДОЙ» — ПА ЖЫЦЦІ!**

**ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА IV КВАРТАЛ 2010 г.**

*Падпіска праз РУП «Белпошта» (кошт у рублях)*

| Індэкс | месяц | IV квартал |
|---|---|---|
| 63850 (індывідуальны) | 12400 | 37200 |
| 63145 (інд. для ветэранаў вайны, пенсіянераў) | 11600 | 34800 |
| 63858 (ведамасны) | 19900 | 59700 |
| 63239 (ведамасны, для ўстаноў міністэрстваў аховы здароўя, адукацыі і культуры) | 18000 | 54000 |

***Заставайцеся з намі!***

# ДЗІЦЯТКА ЁСЦЬ, «ЗВЯЗДУ» — ВЫПІШАМ!

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЦІ ЗМОЖА КАМАНДА ШТАНГЕ ЗДЗІВІЦЬ ПАРЫЖ?

*Шанцы нашых футбалістаў у матчы з «трохкаляровымі» ацанілі Сяргей Бароўскі і Ігар Гурыновіч*

**СЁННЯ наша футбольная зборная стартуе ў адборачным цыкле да Еўра-2012. Нагадаем, што кантынентальнае першынство пройдзе ў Польшчы і ва Украіне. І дзе, як ні ў краінах-суседках, нашы балельшчыкі максімальна маглі б падтрымаць сваю каманду? Федэрацыя паставіла перад футбалістамі нялёгкую задачу — заняць у групе другое месца. Яно дазволіць праз стыкавыя матчы прабіцца ў фінал. Але ў групе ўсё не так проста: акрамя беларусаў, у ёй французы, румыны, баснійцы, албанцы і люксембуржцы. Для выканання задачы прыйдзецца апярэдзіць кагосьці з двух першых у спісе.**

Першым супернікам беларусаў ужо сёння ўвечары стануць французы — чэмпіёны Еўропы і свету. Праўда, гэта было раней. А сёлетняя паездка на чэмпіянат свету ў Паўднёвую Афрыку стала для французаў адной з самых ганебных. На мундыяль трохкаляровыя прабіліся дзякуючы цуда-голу Анры ў вароты ірландцаў, забітаму з парушэннем правілаў. Да гэтага на працягу адборачнага цыклу каманда не змагла на сваім полі перамагчы румынаў, ледзь-ледзь адолела літоўцаў. У ПАР праблемы працягваліся: Нікаля Анэлька сказаў галоўнаму трэнеру Раймону Даменеку нешта такое, што наўрад ці абодва яны захочуць паўтарыць. Пасля гэтага футбаліста прагналі са зборнай, але гульцы яго падтрымалі і не выйшлі на трэніроўку. Стала канчаткова зразумела, што Раймон Даменек аўтарытэт страціў. Каманда Францыі пакінула чэмпіянат, прайграўшы апошні матч зборнай ПАР і не выйшаўшы з групы. Разбіраць брудную трохкаляровую бялізну імкнуліся прэзідэнт Францыі Нікаля Сарказі і парламент. З той пары ў камандзе змяніўся склад і галоўны трэнер. Анэлька, Рыберы, Эўра і Тулалан, як пачынальнікі і актыўныя ўдзельнікі скандалу, мясцовай федэрацыяй футбола былі дыскваліфікаваныя. Цьеры Анры сам адмовіўся выступаць за зборную, Самір Насры траўмаваны. Няма ў складзе Абіlaля, Гуркюфа і Галаса. Але ў тым і справа, што ў Францыі шмат футбалістаў, якія гуляюць у топ-клубах — той жа Бензема з «Рэала», Малуда з «Чэлсі» і шмат іншых.

Новы галоўны трэнер каманды Ларан Блан, адзін з лепшых абаронцаў у свеце ў свой час і чэмпіён свету-1998, зборныя раней ніколі не трэніраваў. Праўда, са сваім клубам «Бардо» выйграваў чэмпіянат Францыі. За час пасля чэмпіянату свету ён правёў з камандай усяго адзін матч — таварыскі супраць каманды Нарвегіі — і прайграў 1:2. Але і з той пары склад амаль цалкам змяніўся. Хто і як будзе гуляць у камандзе, мы пабачым, напэўна, толькі калі каманды сёння ўвечары выйдуць на «Стад дэ Франс». У сераду, як паведамляе тэлеканал «Еўраньюс», размяшчэнне нацыянальнай зборнай Францыі перад матчам з Беларуссю наведаў Зінэдзін Зідан. Спачатку, праўда, планавалася, што ён будзе ў трэнерскім штабе Блана. Але, як бачым, аўтарытэтны ў нядаўнім мінулым футбаліст абмежаваўся некалькімі парадамі гульцам і назіраннем за трэніроўкай.

Такім чынам, галоўнай праблемай зборнай Францыі з'яўляецца нясыгранасць. Пачынаць з чыстага ліста заўсёды няпроста. Але ці стане гэта вялікай перашкодай у матчы супраць нашай зборнай? Пра гэта мы пагаварылі з вядомымі беларускімі спецыялістамі Сяргеем Бароўскім і Ігарам Гурыновічам.

**Сяргей БАРОЎСКІ, чэмпіён СССР у складзе мінскага «Дынама», двойчы (у 1994—1997 і 1999—2000 гадах) узначальваў нацыянальную каманду:**

— На старце адборачнага цыклу гуляць з удзельнікам чэмпіянату свету прасцей, чым з камандай, якая не змагла трапіць на мундыяль і ставіць сур'ёзныя задачы. У гэтым плане жэрабя быў для нас прыхільным. Але скандал, які грымнуў у зборнай Францыі, можа як станоўчую ролю сыграць, так і наадварот. Тут усё будзе залежыць ад таго, наколькі Ларан Блан зможа мабілізаваць каманду на гульню. Французы будуць гуляць з ліста пасля ўсяго трох дзён падрыхтоўкі. Таварыскіх матчаў у іх не было — матч з нарвежцамі я не ўлічваю, бо гулялі яны зусім іншым складам. Немагчыма нават меркаваць, у якім складзе будзе зборная Францыі. Але так і цікавей.

***— У складзе зборнай Францыі няма былых зорак...***

— Але гульня таго ж «Зеніта» з «Асерам» паказала, што ў Францыі дастаткова кваліфікаваных футбалістаў. Адназначна, што ўсё будзе залежыць ад таго, у каго які настрой, у каго з супернікаў будзе мацнейшай прага да перамогі.

***— Для нашай зборнай агучаная задача заняць другое месца ў групе. Наколькі гэта рэальна?***

— Калі французы і румыны згуляюць па максімуму, то ў беларусаў шанцаў няма. Але, як сведчыць не адзін адборачны цыкл, заўсёды ёсць спады ў вядучых каманд. Хто думаў, што Славакія, Славенія абыдуць Польшчу, Чэхію ў мінулай кваліфікацыі? Калі браць рэйтынг, то шанцаў няма, але абставіны могуць скласціся і на карысць беларусаў.

***— Наш шанц — шанц аўтсайдара?***

— Зусім не. Аўтсайдары ёсць у групе, і гэта не мы. Наша зборная мае гульцоў добрага ўзроўню. І каб каманда сярэдняга еўрапейскага ўзроўню магла трапіць, па прыкладзе той жа Латвіі, у фінал чэмпіянату Еўропы, патрэбна адпаведная сітуацыя. Гэта выдатны стан сваёй каманды і перавага над настроем праціўніка. Будзе гэта — тады ёсць добры шанц пазмагацца за другое месца.

***— У матчы з румынамі, другім моцным супернікам, з якім мы сустракаемся адразу пасля французаў, 7 верасня, якія нашы шанцы?***

— Тыя ж, што і з французамі. Усё будзе залежыць ад гатоўнасці каманды 7 верасня. І наколькі правільна спрацуем з румынамі, з якімі не так даўно сустракаліся ў межах адборачнага цыклу. Трэба ўлічыць памылкі тых гульняў і згуляць на максімуме сваіх сілаў.

**Ігар ГУРЫНОВІЧ, чэмпіён СССР у складзе мінскага «Дынама»:**

— Наш супернік зусім не слабы. У зборную Францыі прыцягнутыя новыя людзі, і яны будуць даказваць, што заслужана трапілі ў каманду. Гульня будзе надзвычай складанай. Францыя ў любым складзе і стане — дастаткова моцны супернік.

***— Магчыма, нам дапаможа нясыгранасць праціўніка...***

— Вядома, мы жадаем нашай зборнай перамогі. Але мы яшчэ не зборная Германіі, каб асноўным матывам пройгрышу зборнай Францыі стала іх нясыгранасць. Мяркую, у любым складзе, нават нясыграным, Францыя — моцны супернік.

***— Нашай камандзе па сілах заняць другое месца ў групе?***

— Яшчэ ў былыя часы Эдуард Васільевіч Малафееў казаў, што трэба патрабаваць выніку найвышэйшага і атрымаеш рэальна магчымы. Застаецца толькі пажадаць поспехаў нашай камандзе.

***— Вы лічыце, абысці французаў ці румынаў і заняць другі радок нам пакуль цяжка?***

— У жыцці бывае ўсё. На полі гуляе не Штанге, а футбалісты, і ўсё залежыць ад іх самаадчачы і матывацыі. А чэмпіянат Еўропы, мяркую, добрая матывацыя.

***— Што скажаце пра стан нашай зборнай?***

— Усе гульцы, акрамя Кутузава, у якога сезон толькі пачаўся, павінны быць у добрай форме — чэмпіянаты Беларусі і Расіі даўно пачаліся. Глеб не ў самай лепшай форме. Але гэта можна кампенсаваць самаадчачай і разуменнем таго, што ты гуляеш за зборную.

***— Але Кутузаў і Глеб — нашы лідары, на якіх Штанге заўсёды рабіў стаўку...***

— Было шмат матчаў, калі не гуляў Глеб, і каманда выглядала вельмі прыстойна...

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

# З ДНЁМ НАРОДЗІНАЎ, НАВАПОЛАЦК!

52-ю гадавіну горада жыхары Навапалацка святкуюць з размахам. Хай сабе і не круглая дата, але добрая нагода ў чарговы раз усім тутэйшым і гасцям горада, сабраўшыся на агульнае свята, прызнацца ў любові гораду нафтаперапрацоўшчыкаў. У рамках Дня горада ўжо адбылося некалькі цікавых акцый: на цэнтральнай плошчы ўвечары быў канцэрт класічнай музыкі «Музычныя вечары «Белай Русі», арганізаваны грамадскім аб'яднаннем «Белая Русь». Нагадаю, што гарадскую арганізацыю «Белай Русі» ўзначальвае прызёр алімпіяды Вадзім Дзевятоўскі. А ў Дзень ведаў «Белая Русь» запрасіла гараджан на канцэрт альтэрнатыўнай моладзевай музыкі. Безумоўна, у гэты дзень у цэнтры ўвагі была будучыня Навапалацка — дзеці і моладзь, якія ўдзельнічалі ў агульнагарадской урачыстай лінейцы-канцэрце. Між іншым, кіраўнікі гарадскіх уладаў спрабуюць гаварыць з моладдзю на «адной мове»:

— Вядома, моладзь цяпер іншая. Трэба разумець юнакоў і дзяўчат, гаварыць з імі на адной мове, ведаць модныя моладзевыя плыні. Я сваім падначаленым кажу — трэба раіцца з моладдзю, пытаць, што вам цікава, чаго не хапае ў горадзе? Я сама сустракаюся са старшакласнікамі, якія задаюць вельмі актуальныя і важныя пытанні, — расказвае «Звяздзе» **старшыня Навапалацкага гарвыканкама Наталля КАЧАНАВА**.

— Так, неабходны сучасныя забаўляльныя комплексы, сучаснага кінатэатра, на жаль, у нас няма... Нам патрэбны і новыя спартыўныя збудаванні. Усяго ў Навапалацку каля 240 спартыўных аб'ектаў (з міні-футбольнымі палямі і гэтак далей). Нешта адрамантавалі, недзе правялі мадэрнізацыю. Але гэтага мала. Спартыўныя залы запоўненыя.

Трэба вырашаць і адмоўную дэмаграфічную сітуацыю, прапагандаваць сярод моладзі інстытут сям'і. Каб заахвочваць нараджальнасць, дэпутаты гарадскога Савета ў свой час падтрымалі прапанову гарвыканкама па выплачванні з мясцовага бюджэту бацькам пры нараджэнні немаўляці 100 тысяч рублёў. Зразумела, грошы невялікія, але шчаслівыя бацькі адчуюць клопат і маральную падтрымку з боку уладаў...

Між іншым, цікавая «фішка» святкавання — падарунак для таты, у якога з'явіцца нашчадак непасрэдна ў Дзень горада. Добра, калі такі тата будзе не адзін.

Цікавы вопыт ёсць у Навапалацку па рабоце з сем'ямі. У прыватнасці, паспяхова дзейнічае спецыяльна створаны гарадскі бацькоўскі камітэт, на пасяджэннях якога абмяркоўваюцца самыя розныя пытанні . «Белая Русь» усіх ахвотных збірае на дыскусійныя клубы.

Менавіта сям'я стане галоўным «персанажам» урачыстага адкрыцця свята горада. 4 верасня на плошчы Будаўнікоў адбудзецца грандыёзная акцыя «Навапалацк — вялікая сям'я, разам мы — сто тысяч Я», якая распачнецца пасля святочнага шэсця ганаровых гасцей свята, заслужаных людзей горада, працоўных калектываў. Дружныя шматдзетныя сем'і, цэлыя працоўныя дынастыі, маладажоны — усе падымуцца на сцэну і змогуць павітаць горад, землякоў. Потым канцэрт-віншаванне дадуць артысты з расійскага Пскова.

Вельмі насычаная праграма Дня нараджэння. Гэта і гарадскі конкурс альтэрнатыўнай творчасці тых, хто займаецца харэаграфіяй «Пункт адліку», і гала-канцэрт творчых калектываў горада, святочны феерверк, а таксама моладзевая дыскатэка «да раніцы». «Горад майстроў», святочны гандаль — усё гэта для таго, каб стварыць у гараджан добры настрой. Наўрад ці нехта захоча застацца дома і не ўбачыць на свае вочы свята, паўдзельнічаць у ім. Святкаванне працягнецца і ў нядзелю. Адбудзецца свята нацыянальнай культуры з работай пляцовак народных умельцаў, канцэртамі калектываў і выканаўцаў з Навапалацка, Полацка. Віцебска. На стадыёне пакажуць майстэрства цыркачы-канатаходцы з Кыргызстана...Віват, Навапалацк, са святам, горад!

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# КУПІЦЬ БІЛЕТ, НЕ ВЫХОДЗЯЧЫ З ДОМУ

Купіць білет на любы сталічны канцэрт цяпер стала яшчэ прасцей. У Беларусі распачаў працу электронны партал **kvitki.by** — унікальны інтэрнэт-рэсурс, які змяшчае ўсю інфармацыю пра падзеі і мерапрыемствы, што праходзяць у Мінску і за межамі Беларусі.

Самі распрацоўшчыкі называюць праект унікальным — упершыню ў Беларусі створана інфармацыйная сістэма продажу білетаў на ўсе мерапрыемствы ў ан-лайн рэжыме (фестывалі, канцэрты, тэатр, кіно, спартыўныя падзеі). Вопыт распаўсюджвання білетаў стваральнікі kvitki.by перанялі ў літоўцаў. У 2004 годзе кампанія Bilietai LT распрацавала і ўкараніла першую ў Літве электронную сістэму продажу білетаў. Такую ж тэхналогію апрабіравалі і ўкраінскія калегі: партал kvitki.ua ва Украіне сёння — рэалізатар больш як 50 працэнтаў білетаў па горадзе Кіеве.

Беларускі партал kvitki.by сваю працу распачаў у чэрвені. Меню сайта адаптавана для зручнага карыстання — усе мерапрыемствы разбітыя па катэгорыях, датах і месцах правядзення. Кожны наведнік сайта можа пабачыць план рассадкі ў зале, выбраць і забраніраваць жаданае месца. Інфармацыя пра колькасць вольных білетаў і іх кошт пастаянна абнаўляецца. Забраніраваўшы білет, яго можна выкупіць ў касах kvitki.by альбо звярнуцца ў кур'ерскую службу сайта. Дадатковую інфармацыю па набыцці білетаў можна атрымаць па тэлефоне 110.

**Ілья ЛАПАТО.**

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №УМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

**Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.**

**НАШ АДРАС**: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**ТЭЛЕФОНЫ**: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

**http:**//www.zviazda.by;

**e-mail:** info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 4312 Нумар падпісаны ў 19.30.**

**М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12**

**П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12**